№ 174 (2663) ПЯТНІЦА, 2-га ЖНІЎНЯ 1929 ГОДА

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Центральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769

Гатар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незакарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Змест кнігаў: інвалідзкія месячныя — 20 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пасьля тэксту — р. 30 к.
За кожны дадатковы 1 р. — к.
За радок пасьля першага тэксту 1 р. 50 к.
Сямейныя ці 50 проц. скідкай.
Змест тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумент . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . . 15 „
Бесправаротныя і чырвонаармейцы за дакумент . . . 15 „
За кожны дадатковы . . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 174 (2663) Пятніца, 2-га жніўня 1929 г.

ПРЭЧ ПАДПАЛЬШЧЫКАЎ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЕ ВАЙНЫ!

Працоўныя БССР дэманструюць сваё адзінства ў справе захаваньня міру і гатоўнасьць абараняць Савецкі Саюз.

25-цітысячная дэманстрацыя працоўных Менску.

...дэманстрацыю прышло звыш ...00 чалавек.

...тынг адчыніў прадстаўнік акружнога партыі т. **Хлеўнікаў**.

...ова ад імя ЦК КП(б)Б і акружкома КП(б)Б атрымоўвае т. Славінскі. Сёньня споўнілася 15 год, як П...нацыянал здрадзіў інтарэсам рабочай клясы; сёньня споўнілася 15 год, ...сьветны імпэрыялізм за аўладаньне гегемоніяй на рынках апрануў дзесяткі мільёнаў у шынэлі і кінуў іх у...ную бойню. Гэта катастрофа...вала рабочым і селянам амаль ...сьвету дзесяткі мільёнаў паранеі забітых, каштавала сотні мільярдаў рублёў.

...сьня сусьветнай бойні сацыял-фашысты запэўнялі, што такая катастрофа...жо не паўтарыцца. Між тым з...ым годам сусьветная буржуазія ...больш і больш узбройваецца, вядзе...ую падрыхтоўку да новай імпэрыялістычнай вайны і ў першую чаргу...біраецца напасьці на адзіную ў сьвеце...рэспубліку Саветаў. Сацыял-фашысты...яўляюцца наёмнікамі імпэрыялізму...у іх падрыхтоўцы да вайны супроць...СССР.

...бочая кляса добра разумее, што...уецца новая бойня. Сёньня пралетарыят усяго сьвету выходзіць на вулі...

Пасьля працы—на дэманстрацыю (Менск).

...каб прадэманстраваць сваю салідарнасьць, каб гучна заявіць, што ён...ы ня хоча. Рабочыя імпэрыялістычных краін сёньня заявяць буржуі і сацыял-фашыстам, што яны...апусьцяць вайны супроць бацькаўшчыны пралетарыяту—СССР.

...ны павінны ўзмацняць і пашыраць...будаўніцтва. Лепшы адказ імпэрыялістам усяго сьвету—поўная і своєвая рэалізацыя пазыкі, узмацненьне...абароназдольнасьці краіны, узмацненьне вайсковай падрыхтоўкі рабочых...сіх працоўных.

...учнымі доўгімі воплескамі дэманстранты спаткалі т. **Чарвякова**.

— Сёньня,—кажа тав. Чарвякоў—пралетарыят усяго сьвету выходзіць на вуліцы, каб заявіць свой пратэст супроць вайны, якую рыхтуюць імпэрыялісты.

Цэлы шэраг арганізацый імпэрыялістаў нібы працуе над пытаньнямі разбраеньня, над пытаньнем захаваньня міру, але за шырмамі гэтай працы ідзе самая шалёная падрыхтоўка да вайны. Усе капіталістычныя краіны рыхтуюцца да новай бойні, падрыхтоўка ідзе так, каб у першую чаргу зрабіць напад на СССР. Сусьветны імпэрыялізм прымае ўсе меры, каб справакаваць СССР на вайну. Вось чаму пралетарыят усяго сьвету вядзе барацьбу супроць новай імпэрыялістычнай вайны і рашуча заяўляе:—рукі прэч ад СССР!

У нас досыць сіл, каб абараніць нашы інтарэсы на Усх.-Кіт. чыгунцы, але мы ўпэўнены, што нам удасца абараніць свае інтарэсы без вайны пры дапамозе сусьветнага пралетарыяту, пры дапамозе працоўных Кітаю.

На трыбуне прадстаўнік Камінтэрну нэгр т. **Васэль**, спатканы громам воплескаў.

Тав. Васэль гаворыць, што 1 жніўня рабочыя ўсяго сьвету дэманструюць сваю нянавісьць да буржуазіі.

Рабочыя Эўропы, Амэрыкі і іншых краін сьвету не дазволяць накіраваць гарматы на СССР. Блізка час, калі пад кіраўніцтвам Камінтэрну пралетарыят усяго сьвету пойдзе ў апошні і рашучы бой супроць буржуазіі.

Рабочы 1-й друкарні т. **Крэйнін** заявіў:—мы ні на якія правакацыі ня пойдзем. Мы прыложым усе сілы, каб мірна разьвязаць канфлікт. На У.-К. чыгунцы. Мы на правакацыю адкажам узмацненьнем ваенізацыі працоўных і поўнай рэалізацыяй пазыкі, індустрыялізацыі і выкананьнем 5-цігадовага пляну.

Сацыялістычную бацькаўшчыну мы абаронім.

1-е жніўня—Міжнародны Чырвоны Дзень—Менск, сталіца Савецкай Беларусі, спаткаў у сьвяточным убраньні. Яшчэ зранку працоўны Менск увяціўся чырвонымі сьцягамі і лёзунгамі, якія заклікаюць працоўных яшчэ

Шчыльнымі радамі... (На дэманстрацыі ў Менску).

з большай энэргіяй будаваць сацыялізм, заклікаюць узмацняць абароназдольнасьць краіны Саветаў, пашыраць сацыялістычнае спаборніцтва...

Каля 5-й гадзіны дня рабочыя і наогул працоўны Менск стройнымі шэрагамі з аркестрамі музыкі, з песьнямі накіраваліся на Пляц Волі...

Звыш 25 тысяч рабочых, работніц, працоўнай інтэлігэнцыі сабралася на Пляц Волі... Мора плякатаў з лёзунгамі, напісанымі рабочай рукой паміж працай на вытворчасьці...

Лёзунгі заклікаюць напружыць сілы да ажыцьцяўленьня 5-хгадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва; шлюць оратэрскае прывітаньне зарубежным барацьбітом за справу пралетарскай рэвалюцыі...

Працоўны Менск праз лёзунгі на пязьлічоных плякатах запэўнае партыю і савецкі ўрад у тым, што на першаму закліку рабочых і працоўнай інтэлігэнцыі устануць, як адзін, на абарону СССР—бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту...

Мора народу, сотні плякатаў, музыка, сьпевы—усё гэта ўздымае настрой, натхняе працоўных да яшчэ большых перамог на фронце будаўніцтва сацыялізму...

Але лёзунгі таксама гучна гавораць аб тым, што сусьветны капітал рыхтуе новую імпэрыялістычную бойню, рыхтуе напад на СССР.

— Прэч сусьветны імпэрыялізм! Няхай жыве Камінтэрн—адзіны правадыр пралетарыяту!..

— У дзень 1-га жніўня сусьветны пралетарыят яшчэ шчыльней згуртуецца навакол камуністычнай партыі!..

— Прэч правакатараў новай вайны—кітайскіх фашыстаў — агэнтаў сусьветнага імпэрыялізму!..

Вось заклік працоўных з шматлікіх плякатаў...

1-е жніўня—дзень балвога агляду сіл рэвалюцыйнага пралетарыяту ўсяго сьвету. Там, за межамі СССР, у гэты дзень пральецца кроў тысяч рабочых, тысячы рабочых будуць кінуты ў засьценкі капіталістычных астрогаў.

Але рэвалюцыйны пралетарыят капіталістычных краін не спалохаецца ні астрогаў, ні растрэлаў.

Разам з вамі, ён скажа сёньня свае важкае слова, слова пратэсту супроць падрыхтоўкі імпэрыялістычнай бойні; ён скажа прэч ад рукі сьвет—«Рукі прэч ад нашай бацькаўшчыны—СССР!».

* * *

Адчыняецца мітынг... У чатырох мясцох выступаюць прадстаўнікі партыі, рабочых, работніцы і працоўнай інтэлігэнцыі. З трыбуны на Пляцу Волі голас рабочых Менску радыё разьлясе па ўсім сьвеце, раскажа пра імкненьне пралетарыяту БССР да міру, пра рашучае жаданьне яго спакойна працаваць над узмацненьнем індустрыялізацыі ў Вялікім Саюзе.

Працоўны Менску на ўвесь сьвет магутна заявілі, што сапраўдную палітыку міру праводзіць толькі СССР; яны заявілі, што небясьпека імпэрыялістычнай вайны, як ніколі, наблізілася.

Рабочыя Менску сказалі сваім закардонным братом:

— Мы аддамо ўсе сілы, каб упікнуць вайны, але калі настане час паўстаць на абарону бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту, дык разам з вамі зьменім варштат на вінтоўку і рашуча выступім на абарону нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны ад сусьветнага імпэрыялізму.

В. З.

ГОЛАС МІЛЬЁНАЎ.

...Пляц Волі ня людзьмі набудаваны, ...людзей. З тысяч людзей—пралетарыяў Менску. Пралетарыяў Беларусі. Прайсьці з аднаго канца ў другі—...магчыма падарожжа. Лягчэй пе...сьці праз Эльбрус або Казьбек, чым ...піць з Ленінскай на Рэвалюцыйную.

...Не, тут не народ і ня маса. ...т кляса. Арганізавана. З ...льнымі мэтамі і жаданьнямі. Яна ведае, чаго прышла ...ды і з чым пойдзе.

...Гляньце на сотні лёзунгаў і ...якатаў: вы прачытаеце ду...у клясы, прачытаеце самыя ...ыбокія думкі.

— Імпэрыялісты рыхту...ць новую сусьветную вайну ...я ўмацаваньня імпэрыялі...ычнага рабства. Пралетарыя...анавецеся пад сьцягі Камінтэрну—на барацьбу за зьвяр...ньне капіталізму!

— Прэч правакатараў но...й вайны—кітайскіх міліцыстаў, агэнтаў сусьветнага ...пэрыялізму!

— Панская Польшча і ...ерская Румынія ўзбройва...цца пры падтрыманьні між...народнага імпэрыялізму супроць СССР. Няхай жыве рэ...люцыйная барацьба рабочых ...сілян Польшчы і Румыніі супроць ...ілітарыстаў!

— Урад Макдональда—верны прыдзчык імпэрыялізму. Прэч маскі з ...рыслужнікаў буржуазіі! Няхай жыве ...валюцыйная барацьба пралетарыяту!

— Пралетарыят узбройваецца, каб ...зьбраіць буржуазею. Няхай жыве ...зброенае паўстаньне рабочых і пры...чаных народаў супроць улады ка...італу.

І яшчэ, яшчэ лёзунгі аб шалёнай ...дрыхтоўцы буржуазеі да вайны і ...абходнасьці зьнішчэньня капіталу. ...тні лёзунгаў і ў кожным—душа ...ралетарыя, моц рабочай клясы.

Прамоўцаў можна і ня бачыць—...ны так далёка і, разам з тым, бліз...кія, зразумелыя. Зразумелыя таму, што яны гавораць мовай рабочае клясы, гавораць так, як гаварыў бы ўвесь пралетарыят сьвету. Можна ня чуць слоў, з толькі бачыць гэсты прамоўцы, і вы зразумееце яго, бо ён гаворыць вашымі словамі, выкладае вашы думкі. Узьняты кулак рабочага, нямецкас—«Рот Фронт» альбо «далоў буржуазею», «вайна—вайне»—выклікаюць адзіную думку, адполькавыя патрабаваньні.

Пабудуем сацыялізм... (На дэманстрацыі ў Менску)

Лёзунгі, выступленьні, шматтысячнае „ура"—голас мільёнаў. Голас рабочых Эўропы, Амэрыкі, Індыі, Афрыкі. Гукі зьліваюцца ў магутны голас працоўных сусьвету.

— Вайна—вайне!

— Мы пераможам!

Так. Мы пераможам. Стыхія рэвалюцыі пераможа Чан-Кай-шы, пілсудзкіх, макдональдаў, дэгрібэляў. Пераможа штучна-пабудаваную сыстэму капіталістычных дзяржаў.

Ц.

На вуліцах буржуазных сталіц — панцырнікі і кулямёты.

50 ТЫСЯЧ ПРАЛЕТАРЫЯЎ ПАРЫЖУ ПАКІНУЛІ ВАРШТАТЫ.

ТРУБЫ ФАБРЫК ПЕРАСТАЛІ ДЫМІЦЬ.

ПАРЫЖ, 1-8. На скрыжаваньнях, асабліва навакол заводаў, і наогул у рабочых раёнах згрупаваны значныя атрады пешай і коннай паліцыі. Над горадам лётаюць паліцэйскія самалёты. Водлуг вестак газэт, якія выйшлі а поўдні, сёньня раніцою баставала каля 50000 мэталёўцаў, будаўнічых рабочых і дрэваапрацовачнікаў. Групы маніфэстантаў, якія пачыналі было зьбірацца ў Монтры, разагнаны паліцыяй. У розных аколіцах пры спробах наладзіць дэманстрацыю ўчынена каля 40 арыштаў.

Масавыя аблавы і арышты.

ФРАНЦУСКАЯ БУРЖУАЗЕЯ ЎСІМІ СІЛАМІ ІМКНЕЦЦА НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ АНТЫВАЕННЫХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ.

ПАРЫЖ, 31-7. Па ўсёй Францыі ня спыняюцца арышты і вобыскі ў зьвязку з надыходзячым Міжнародным Чырвоным Днём. Учора паліцыя, ужо трэці раз за тыдзень учыніла вобыск у рэдакцыі «Юманітэ». Пры вобыску арыштован генэральны сэкратар рэдакцыі т. Фарэсье. Учора-ж арыштован т. Лякур—сэкратар 5-й парыскай райённай арганізацыі францускай кампартыі.

Учынены вобыскі на кватэрах генэральнага сэкратара францускай кампартыі т. Сэмара і генэральнага сэкратара ўнітарнай канфэдэрацыі працы тав. Манмусо.

У Лілі ўчынен новы вобыск у рэдакцыю камуністычнага органу паўночнага дэпартаманту «Аншэнэ» і друкарні, дзе друкуецца «Аншэнэ» і іншыя камуністычныя выданьні. Учынены вобыскі і на кватэрах некаторых рабочых. Адзін рабочы арыштован.

У Ліёне ў часе новых вобыскаў, паліцыя канфіскавала брашуры і адозвы.

У Ніцы арыштавана некалькі рабочых, якія распаўсюджвалі адозвы.

У Вішы двое чужаземных рабочых высланы заграніцу.

У Туры ўчынен вобыск у памяшканьні райённай арганізацыі францускай кампартыі.

У Алжыры паліцыя ўчыніла вобыскі ў памяшканьні райённага аб'яднаньня ўнітарных прафсаюзаў, у райённым камітэце кампартыі і на кватэрах некаторых працаўнікоў.

У Аране вобыскі былі ўчынены ў рабочай друкарні, у памяшканьні ўнітарных прафсаюзаў і па шмат-якіх прыватных кватэрах.

У Клішы паліцыя ўночы гвалтам увайшла ў памяшканьне, дзе адбываўся партыйны сход, арыштавала 16 удзельнікаў сходу, канфіскавашы лістоўкі і адозвы.

Інтэрнацыянальныя дэманстрацыі працоўных.

БЭРЛІН, 31-7. За апошнія дні ва ўсходняй Нямеччыне адбылося некалькі міжнародных спатканьняў на мяжы. У Бэтэне (Верхняя Сілезія) на братэрскім спатканьні прысутнічала больш за 8000 рабочых. На парадзе выступалі прадстаўнікі польскай і нямецкай кампартыі і нямецкага кансулёта.

У Дыгенгальсе (Верхняя Сілезія) і ў Адорфе ў масавым братэрскім спатканьні ўдзельнічалі нямецкія і швэдскія рабочыя.

У Марыенбурзе, паволіда якога Каалгаф належыць зараз вольнаму гораду Данцыгу адбыўся супольны мітынг нямецкіх і данцыгскіх рабочых. Нямецкія рабочыя з уздымам віталі атрад данцыгскіх Чырвоных франтавікоў, якія зьявіліся ў поўнай форме саюзу франтавікоў.

Братэрскае спатканьне з прычыны ўмешваньня нямецкай і данцыгскай паліцыі адбывалася так: на адным узьбярэжжы прымежнай рэчкі Зогат сабралася шмат тысяч нямецкіх рабочых, а на другім—данцыгскія рабочыя. На абодвых узьбярэжжах былі выстаўлены значныя атрады паліцыі, якія не дапусьцілі перайсьці мяжу. Трэба адзначыць, што паліцыяй у прымежным райёне Эльбінх, які ўваходзіць у Марыенбург, кіруе сацыял-дэмакрат. У данцыгскім урадзе сацыял-дэмакраты таксама адыгрываюць выдатную ролю. У Гасельвэльдзе (Браўншвэйг) адбыўся чырвоны збор працоўных горнага райёну Гарц.

Загад паліцыі пускаць у ход зброю.

ВЕНА, 31-7. Водлуг паведамленьня югаслаўскага агенцтва, у Загрэбе арыштован Нацыянальны Мат'е Бражовіч „кіраўнік камуністычнай прапаганды Югаславіі, прадстаўнік ЦК югаслаўскай партыі, які пражыў 10 гадоў у СССР, дзе ён прайшоў курсы тэрарыстаў". Бражовіч, пібыта, вярнуўся ў Югаславію на самалёце.

Сацыял-дэмакратычная «Арбэйтэр Цэйтунг» паведамляе, што Бражовіч—адзін з 10-ці камуністаў, выдадзеных югаслаўскай уладзе паліцыяй гораду Граца. Бражовіч удзе ў часе перавозкі яго з Марыбору ў Белград. Газэта заяўляе, што арышт Бражовіча замоўчваўся паліцыяй на працягу некалькіх дзён, паліцыя падрыхтоўвала забойства Бражовіча.

У Загрэбе, у зьвязку з Міжнародным Чырвоным днём паліцыя разьвівае шалёную дзейнасьць. Усюды шукаюцца камуністычныя арганізацыі.

У Загрэбе арыштавана каля 100 рабочых і студэнтаў, западозраных у прыналежнасьці да кампартыі. Агалошан загад рабочым працаваць 1-га жніўня, пад пагрозаю рэпрэсій. Паліцыі дан загад пусьціць 1-га жніўня ў ход зброю пры малейшым адпоры асоб, якія зьбіраюцца наладзіць дэманстрацыю ці мітынг.

ХЛУСЬНЯ БУРЖУАЗЕІ

БЭРЛІН, 31-7. Увяцаючы нацкоўваньне на нямецкую кампартыю ў зьвязку з надыходзячым Міжнародным Чырвоным Днём буржуазныя сацыял-дэмакратычныя газэты спаборнічаюць адны з адным пры выдумцы новых „сэнсацый", якія сьведчаць аб імкненьні камуністаў наладзіць 1 жніўня пераварот.

Асабліва стараецца сацыял-дэмакратычны „Форвэртс" і «левая» сацыял-дэмакратычная газэта «Лейпцыгер Фольксцайтунг».

Паліцыя заняла стратэгічныя пункты.

ПАРЫЖ, 31-7. З самага раніку ў Парыжы адчуваецца некаторае незвычайнае ўзрушэньне. Ужо да 10 гадзіны раніцы распрадаўся, бадай, што ўвесь тыраж „Юманітэ". Да вечара напружаньне ўзмацняецца. Вячэрнія газэты паведамляюць пра далейшыя падрыхтоўкі паліцыі. Ад 4 гадзіны дня спэцыяльныя парады паліцыі занялі намечанае для іх па ўсім горадзе месца. Буржуазны друк карыстаецца ўсімі прычынкамі дзеля таго, каб стварыць варожы камуністам настрой.

„Нагрузку" паліцыя выканала ноччу.

ПАРЫЖ, 1-8. Учачы на 1-га жніўня канфіскован яшчэ на друкарскай машыне першажнівеньскі нумар «Юманітэ» і спынена далейшае яго друкаваньне. Арыштавана яшчэ каля 40 камуністаў, вінаватых, водлуг слоў „Матэн", за ўдзел ў падрыхтоўцы дня 1 жніўня. Падпісана ўжо 58 ардэроў на арышты і на высылку чужаземцаў.

Жах перад выступленьнем камуністаў.

ВЕНА, 31-7. Буржуазны друк прызнае, што „усю Эўропу ахапіў жах перад надыходзячым выступленьнем камуністаў". Сацыял-дэмакратычная „Арбэйтэр Цэйтунг" заклікае рабочых ня браць удзелу ў дэманстрацыі. У Вене ўся паліцыя, жандармерыя, гарадзкая варта 1 вайсковыя часьці знаходзяцца ў баявой гатоўнасьці.

Вэнгэрская кампартыя заклікае.

ВЕНА, 31-7. Водлуг паведамленьня вэнгэрскага друку ў рабочых раёнах Будапэшту ў апошнія дні зьявіліся шматлікія адозвы нелегальнай вэнгэрскай кампартыі з заклікам да дэманстрацыі 1 жніўня, не зважаючы на паліцэйскую забарону. Адозвы карыстаюцца вялікім посьпехам. Паліцыя загадана ў зарадку прыдушваць усе спробы да наладжваньня дэманстрацыі.

Канфіскацыя „Ротэ Фанэ".

ВЕНА, 31-7. Учынена шмат арыштаў. Канфіскавана „Ротэ Фанэ". Забаронена наладжваньне дэманстрацый.

Урад СССР зрабіў усё магчымае для аднаўленьня зносін з Англіяй

Макданальдаўцы ня сходзяць з шляху цьвёрдалобых.

(*Паведамленьне ТАСС*).

29-га ліпеня паўнамоцны прадстаўнік СССР у Францыі т. Даўгалеўскі атрымаў на падставе апошняга абмену нотамі між вялікабрытанскім урадам і савецкім урадам запросіны міністра замежных спраў Гэндэрсона прыехаць у Лёндан і меў з ім доўгае спатканьне.

У адпаведнасьці з нотаю савецкага ўраду ад 23-га ліпеня г. г. тав. Даўгалеўскі заявіў, што ён мае даручэньне савецкага ўраду распачаць перамовы з Гэндэрсонам выключна з мэтаю абмеркаваньня найбольшай шпаркасьці працэдуры далейшага абмеркаваньня ўсіх спрэчных пытаньняў між СССР і Вялікабрытаніяй. Тав. Даўгалеўскі заявіў далей, што ў інтарэсах абедзьвюх краін і асабліва ў інтарэсах умацаваньня ўсеагульнага міру, савецкі ўрад лічыць неабходным неадкладнае назначэньне паслоў, прычым, ідучы насустрач жаданьню Вялікабрытаніі, савецкі ўрад згодзен, каб абмеркаваньне ўсіх спрэчных пытаньняў адбывалася ў Лёндане і было распачата неадкладна пасьля назначэньня паслоў. На думку савецкага ўраду, гэты шлях зьяўляецца найбольш мэтазгодным, і шпаркім для дасягненьня згоды па ўсіх спрэчных пытаньнях між СССР і Вялікабрытаніяй.

У адказ на гэта Гэндэрсон заявіў у катэгарычнай форме, што неадкладнае аднаўленьне дыплёматычных зносін між Вялікабрытаніяй і СССР немагчыма і прапанаваў спачатку пачаць не пазьней 14-га жніўня перамовы па сутнасьці ўсіх спрэчных пытаньняў між Вялікабрытаніяй і СССР, дзеля чаго паслаць савецкую дэлегацыю ў Лёндан.

31-га ліпеня т. Даўгалеўскі перадаў Гэндэрсону такі адказ Народнага Камісарыяту па Замежных Справах па прапанову вялікабрытанскага ўраду:

„Урад СССР зрабіў усё, каб палегчыць збліжэньне між СССР і Вялікабрытаніяй і аднаўленьне нармальных дыплёматычных зносін між імі. Аднак, заява міністра замежных спраў Вялікабрытаніі т. Даўгалеўскаму аб немагчымасьці для ўраду Вялікабрытаніі аднавіць нармальныя зносіны між абедзьвюма краінамі без папярэдняга вырашэньня спрэчных пытаньняў між імі сьведчыць, што ўрад Вялікабрытаніі ня хоча ці ня можа згадзіцца на аднаўленьне гэтых зносін. У іншым разе вялікабрытанскі ўрад прапанаваў-бы, як папярэднюю ўмову для аднаўленьня нармальных зносін, вырашэньне па сутнасьці такіх складаных і спрэчных пытаньняў, як узаемныя пратэзіі і контр-пратэзіі. Гэта новая прычына, не прадугледжаная ў поце вялікабрытанскага ўраду ад 17-га ліпеня, патрабуе новага сэрыяльнага разгляду пытаньня, з гэтае прычыны Народны Камісарыят па Замежных Справах прымушан зьвярнуцца за дырэктывамі да прэзыдыуму ЦВК СССР, чарговы пленум якога разглядзіць новыя прапановы вялікабрытанскага ўраду».

Тав. Даўгалеўскі пасьля перадачы гэтага адказу з прычыны вычарпанасьці яго місіі вярнуўся ў Парыж.

Патрабуюць аднавіць зносіны з СССР.

ЛЁНДАН, 31-7. Да міністра па справах Шатляндыі Адамсона і міністра земляробства Ноэля Бэкстона паведала дэлегацыя прадстаўнікоў усіх галін ангельскага нафтавага промыслу і катэгарычна патрабавала аднаўленьня зносін з СССР.

Абодвы міністры абяцалі ўважліва разглядзець заявы дэлегацыі і напомнілі ёй, што з 1-га жніўня законадаўства аб гарантыі крэдытаў па замежнаму гандлю распаўсюджваецца і на зьдзелкі СССР.

Забясьпечыць уладаньне на Усходзе.

ЛЁНДАН, 30-7. Згодна паведамленьня органу рабочай партыі „Дэйлі Гэральд" ангельскі ўрад разглядае ў сучасны момант „папярэдні нарыс праэкту англа-эгіпецкага ўгавору". Вайсковы міністр Том Шоу на мітынгу заявіў: „Мы намераны даць Эгіпту незалежнасьць на такіх умовах, якія створаць дружбу між намі і Эгіптам, забясьпечыўшы назаўсёды сілы зносін між Англіяй і ва ўладаньнямі на Усходзе.

* * *

ЛЁНДАН, 30-7. Эгіпецкая газэта „аль-Ахрам" паведамляе, што ў Лёндан хутка будуць выкліканы выдатныя прадстаўнікі грамадзкіх колаў для абмеркаваньня англа-эгіпецкага ўгавору.

На фронце клясавай барацьбы.

Бастуе 30 джутавых фабрык.

ЛЁНДАН, 31-7. Забастоўка тэкстыльшчыкаў на 30 джутавых фабрыках у Калькуце (Індыя) ня спыняецца. Бастуючыя выстаўляюць пікеты і заклікаюць абвясьціць усеагульную забастоўку, патрабуючы павялічыць заработак і скараціць нядаўна ўведзены 60-цігадзінны рабочы тыдзень.

Разгон дэманстрацыі.

НЬЮ-ЁРК, 30-7. У Торосто (Канада) адбыліся дэманстрацыі пратэсту проці правакацыйнага выступленьня папкінскага ўраду. Паліцыя паскочыла на дэманстрантаў, зьбіваючы іх. Частка ўдзельнікаў дэманстрацыі была арыштавана.

Камуністы адмовіліся даваць паказаньні.

ПАРЫЖ, 30-7. Агенцтва Гаваса паведамляе: „Арыштаваныя за апошнія дні камуністы заявілі міністру юстыцыі пратэст проці арыштаў і адмаўляліся даваць паказаньні судоваму сьледчаму".

Лёкаут трывае далей

ЛЁНДАН, 31-7. Лёкаут у ангельскай тэкстыльнай прамысловасьці адбываецца далей. Становішча бяз зьмен. Лёкаут тэкстыльнай прамысловасьці ўжо адбіўся і на некаторых іншых галінах прамысловасьці.

Працэс „15" адновіцца ў канцы жніўня

НЬЮ-ЁРК, 30-7. З прычыны выразнае варожага настрою буржуазнага насельніцтва Гастоніі да 15 удзельнікаў забастоўкі тэкстыльшчыкаў у Гастоніі, абвінавачаных у забойстве начальніка паліцыі, суд ухваліў перанесьці разгляд справы ў горад Харлоту (штат Паўночная Караліна). У зьвязку з пераносам разгляду справы ў Харлоту, працэс адновіцца толькі ў канцы жніўня.

Паліцэйскі кантроль.

ПЭЙПІН. Паліцэйская ўлада патрабавала падаць на працягу тыдня сьпіс савецкіх грамадзян, якія жывуць у Пэйпіне, з занатоўкаю іх занятку і г. д.

Гандаль панцырнікамі і кулямётамі.

НЯМЕЧЧЫНА І ЧЭХАСЛАВАКІЯ ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЬ СУСЕДЗЯЎ.

ВЕНА, 31-7. Газэта „Абэнд" паведамляе, што праз аўстрыйскую тэрыторыю з Нямеччыны ў Будапэшт высланы 4 панцырнікі. У чыгуначных дакумантах панцырнікі былі найменаваны «грузавікамі". Вэнгэрскае тэлеграфнае агенцтва завярас, што правоз панцырнікаў быў легальным і наладжан з ведама аўстрыйскага і нямецкага ўрадаў.

„Абэнд" паведамляе таксама і аб пасылцы з Пільзэну (Чэхаславакія) у Югаславію поезду з 14-ці таварных вагонаў, нагружаных пад выглядам «перавозачных сродкаў» кулямётамі і прыладамі да гармат. Груз пасылаюць чэскія заводы зброі Шкода.

Ня ўмешвацеся ў ангельскія справы!

Ультыматум Англіі Кітаю.

ЛЁНДАН, 31-7. Ультыматум Англіі Кітаю, пасьля адмовы Кітаю, ня ўмешвацца ў ангельскія справы, ня ўмешвацца ў ангельскія справы, ня ўмешвацца ў ангельскія справы

ЧЫСТКА ПАРТЫІ І АПАРАТУ.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЧЫСТКІ Ў НКЮ ПРАВЕДЗЕНА СЛАБА.—ТАМ ЦЕГАНІНА—ХРАНІЧНАЕ ЗЬЯВІШЧА.—„БЫЛЫЯ ЛЮДЗІ“ Ў НАРКАМЗЕМЕ.—«У НАС НЯМА ПРАВЫХ».—У МСЬЦІСЛАЎСКІМ РАЙЁНЕ ВЯСКОВЫЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА ЧЫСТКІ.

Слабое палітвыхаваньне.

На сход па чыстцы партыі ў Шамаве сабралася да 150 чалавек, большая частка з якіх прыпадала на батрацтва і беднату. Зьявіўшаяся група заможнікаў і падкулачнікаў, якая пыталася дыскрэдытаваць асобных камуністых, атрымала рашучы адпор ад беднаты і батракоў. Выявіліся ў Шамаве гора-камуністы Красоўскі Н., селянін бядняк, які разводзіў агітацыю сярод сялян: На што вам садзіць сады, вас усё адно пагоняць у калгас і вашы труды прападуць. Красоўскі зусім палітычна неграмотны, над сабой не працуе, у даручаній яму працы Шамаўскага машынага таварыства дапусьціў тое, што вол забраў сабе кіраўніцтва і ледзь не развалі ў усю працу. Красоўскаму прыклеіся даць суровую вымову з папярэджаньнем.

Тав. Кнышоў—настаўнік, сябра партыі, член праўленьня спажывецкага таварыства. Скарыстоўвае сваё службовае становішча ў асабістых мэтах. Кнышоў атрымаў парт. спагнаньне.

Шамаўская ячэйка партработу праводзіць слаба, увага камуністых на момантах калектывізацыі сельскай гаспадаркі не завострана. Батракі слаба ўцягваюцца ў артыю. Сярод іх не праводзіцца ніякай выхаваўчай працы. Шамаўская ячэйка КНБ да чысткі сваіх шэрагаў не рыхтавалася.

Дрэнна справа ў Шамаўскай ячэйцы, але ў Паполтаве яшчэ горш. З праверных 6 камуністых партспагнаньне атрымала 5. Усе пагалоўна палітычна неграмотныя. Як радавыя сябры партыі, так і сакратар у адзін голас гаварылі: „У нас правых укланістаў няма“, а тое, што яны праводзяць рост за лік сярэднякоў абмяжоўвае батрацтва і не падрыхтоўвае яго да наступленьня ў КП(б)Б—яны проста лічаць за маленькую недарэчнасьць.

Казлоў, сябр партыі з 1924 году. Разваліў калектыў, у апошні час праводзіў агітацыю супроць арганізацыі калектыўных гаспадарак, п'янствуе, браў хабар за адпускаемы лес. Як вартаўнік Курмаўскага лясьніцтва, у двары ў сябе меў самагонны апарат. Выключан з партыі.

Батракі і беднякі Пацолтаўскага с-с пастанову тройкі адабраюць.

Шурэхта. Сябр партыі. Настаўнік. Будучы старшынёй рэвізійнай камісіі спажывецкай кааперацыі скарыстоўваў свае службовае становішча ў сваіх мэтах. П'янствуе, заводзіў у сябе ў школе папойкі з райпрацаўнікамі, выказваў сваю думку аб тым, што „ўсё забралі жыды“. Выключан з партыі.

У цэлым, Пацолтаўская ячэйка безаўтарытэтна, ня мае ўплыву на масы. Ячэйцы патрэбна вялікая дапамога і чым хутчэй, тым лепш для партарганізацыі.

Добрае ўраджаньне складае праверная ячэйка Старага Сяла. У ячэйкі 7 камуністых, праверана з іх 6, ніводзін парт. узысканьня не атрымаў. У ячэйкі 3 батракі, 4 сераднякі, але асноўнае, вакол чаго вядзе працу Старасельская ячэйка—гэта калектывізацыя. Праведзена вялікая падрыхтоўчая праца з насельніцтвам да арганізацыі калектыву. Увесь сход, толькі і гаварыў, што аб арганізацыі калектыву і аб тым, што ў старасельскай ячэйцы—партыйцы сапраўдныя камуністыя.

У цэлым, з папярэдніх выпікаў чысткі Мсьціслаўскай вясковай парт. арганізацыі патрэбна зрабіць 3 вывады:

1. Вясковыя ячэйкі не падрыхтаваліся да чысткі, слаба падрыхтаваныя масы, не праведзена ніякая работа з батрацтвам і беднатой па ўцягненьню іх у партыю на замену вычышчаных.

2. Вясковыя камуністы не стаяць вышэй па палітычнаму ўзроўню, а часта адстаюць ад беспартыйнай масы, бо па маючыхся фактах, калі беспартыйны чытае газэты „Зьвязда“, „Беднота“, „Известия“ і, нават, зрэдка, „Правду“, дык камуніст абмяжоўваецца толькі „Беларускай Вёскай“, і то ня кожны.

3. Інструкцыі ЦКК УсеКП(б) не прапрацаваны, а ў выніку—камуністы нават ня ведаюць пра задачы чысткі партыі.

Першыя вурокі Мсьціслаўскай партарганізацыі патрэбна ўлічыць і зьвярнуць максымальную ўвагу на якаснае правядзеньне чысткі партарганізацыі.

С.

Чыстка апарату НКЮ.

З дакладаў рабочых брыгад, якія абсьледвалі працу апарату НКЮ відаць, што там маюцца старыя царскія бюракраты, якія фармальна падыходзяць да справы. Ёсьць і такія супрацоўнікі, якія маюць партыйныя білеты ў кішэні, але ня выконваюць пастаноў і дырэктыў партыі і ўлады. Брыгады адзначылі, што падрыхтоўка да чысткі была праведзена вельмі слаба; слаба вялася і масавая праца ў НКЮ, асабліва між малодшым судовым пэрсаналам на раёнах. НКЮ мае слабую сувязь з фабрыкамі і заводамі. Гэта пацьвярджаецца тым, што з боку рабочых няма зацікаўленасьці да чысткі апарату НКЮ, дзякуючы чаму на пасяджэньне камісіі ня прышоў аніводзін рабочы, хоць іх і запрашалі тры разы.

Цеганіна ў НКЮ стала такім хранічным зьявішчам, што адзін раз НКЮ ня пісаў цэлы месяц цыркуляру, ня ведаючы, што значыць слова... шынкарства! Маюцца выпадкі, калі судзьдзі ў раёнах вядуць хаўрус з кулакамі.

Трэба адзначыць, што мова нашых судоў кансэрватыўная і адсталая па сваёй форме, і што некаторыя прысуды звычайнаму сьмяротнаму незразумелы.

З боку НКЮ няма сыстэматычнага нагляду за працаю візавых судовых устаноў; няма дастатковага кантролю іх дзейнасьці. На раёнах былі выпадкі скрыўленьня клясавае лініі.

Брыгады выказваюцца за грунтоўную рэарганізацыю НКЮ, што павінна палепшыць працу.

У працэсе праверкі паасобных супрацоўнікаў выявілася, што пракуратура НКЮ сьвядома ці несьвядома скрыўляла клясавую лінію; жывым узорам гэтага зьяўляецца пракурор НКЮ па агульнаму нагляду гр. **Банін**. Ён сын дробнага чыноўніка, мае вышэйшую адукацыю. У даваенны час быў праваабаронцам па важнейшых палітычных справах. Да 1917 году належыў да партыі «Народная Воля». У 1918 г. быў арыштаваны савецкаю ўладаю ў Менску і высланы ў Смаленск. З матар'ялаў камісіі па чысткі відаць, што гр. Банін і іншыя гр-не з пракуратуры сваім загадам затрымлівалі таргі на дом нейкага спэкулянта Лапірава; дом гэты прадаваў Полацкі Акрфа за доўг дзяржаве.

Далей ідзе гр-н **Барышоў**—старшы інструктар НКЮ. Да апошняга часу мае цесную сувязь з гаспадаркаю ў Віцебскай акрузе. Перад вайною меў разам з бацькам 40 дзесяцін зямлі, якую захоўваў ад абрэзкі да 1924 г. Сёлета гаспадарка абкладваецца ў індывідуальным парадку.

Гр. Барышоў даваў заключэньні па судовых справах ня ў духу савецкага права, прытрымліваючыся больш формы, чым сутнасьці. У пытаньнях рацыяналізацыі апарату, якія ўзьнімаліся па мясцох, гр-н Барышоў адбіраў ініцыятыву мае, гаворачы, што „гэта справа разглядаецца ў НКЮ“.

Гр-н **Несьцер**—член вярхоўнага суду. Выступаўшыя даказвалі, што ён безпадстаўна звольніў з пасады машыністку з НКЮ, і зрабіў пратэкцыю сваёй свячэны пры паступленьні на службу ў акруговы суд.

С.

Чыстка апарату НКЗ.

Гр-н **Бехцееў**. У камісіі па чысткі есьць матар'ял, што гр. Бехцееў позна зьяўляецца на працу і сыстэматычна п'янствуе.

Не зьяўляецца своечасова на працу у Дасьледчы Інстытут, у выніку чаго спынілася вельмі важная дасьледчая справа ў галіне земляробства. Выступаўшыя таварышы адзначалі, што спачат ку гр-н Бехцееў быў сумленным працаўніком, але ў апошні час сапсаваўся. Заўважана таксама, што ён неакуратна зьвяртае ўзятыя авансы.

Гр-н **Нефедаў**—працуе ў адзеле вялікарацы. Супрацоўнікі адзначылі, што хоць гр-н Нефедаў і зьяўляецца вялдым савецкім спэцыялістам, але са сваімі заданьнямі не спраўляецца. Па торфстанцыі ёсьць шэраг недахопаў, на выпраўленьне якіх гр-н Нефедаў не зьвяртаў увагі, выконваючы свае абавязкі аўтаматычна. Гр-н Нефедаў, адказваючы на прамову гр-на Бехцеева, папракае яго, што Бехцееў *прасьпляў яму, Нефедаву, такія выканальні, якіх нельга было выканаць* за тры дні (за 3 дні пабудаваць лёдзік).

Далей гаворыць, што некаторыя спэцыялісты высокае кваліфікацыі займаюцца дробязьзю, як выкладка клетак (у тарфяной справе).

Гр-н **Міхайлаў**.—Некаторыя супрацоўнікі выказаліся, што гр-н Міхайлаў, працуючы ў мэліарацыйнай групе, няўважліва адносіцца да сваіх супрацоўнікаў, якія дарма траціць час, стаячы перад яго сталом па 15-20 хвілін.

Гр-н **Васюкевіч**.—Служыў у стараў арміі, меў чын чыноўніка ваеннага часу.

Будучы па працы ў НКЗ варожа адносіўся да вылучэнцаў. Ён адказваў груба, калі вылучэнка зьвярталася да яго, каб ён зрабіў што небудзь у справах НКЗ:

„Не тваё гэта дзела“.

Гр-н Васюкевіч быў грубы з наведвальнікамі, антысэміт, любіў пакрыкваць на малодшых супрацоўнікаў НКЗему.

У спрэчках тав. Даўгаланцева (вылучэнка-батрачка) адзначыла, што гр-н Васюкевіч крычаў на машыністку Адамовіч за тое, што яна яго прасіла прачытаць незразумелае слова ў сялянскай заяве.

Гр-н **Вішнеўскі**.—Былы земскі начальнік з 1906 г. У студзені і люты 1917 году быў віцэгубарнатарам. Радня яго мела праз яго жонку сувязь з дваром Мікалая II. Працаваў у «Вялікай Полацке» па справах спадчыны.

Цесьць яго быў заядлым манархістам. У 1922 годзе Вішнеўскі быў сябрам Менскага сабору, дзе вёў рэакцыйную працу, за што некалькі разоў арыштоўваўся савецкаю ўладаю. На запытаньне, як працаваў і працуе цяпер, пры савецкай уладзе, адказвае:

— «Да, за деньги».

Вішнеўскі, за працу па падрыхтоўцы праэкту зямельнага кодэксу БССР, якую выконваў у службовы час, атрымаў 600 р. На запытаньне „Вашы адносіны да самакрытыкі?“:—адказаў. «Не понимаю вопроса.»

Чужы элемэнт.

Яшчэ ўвосень 1928 г. быў звольнен з арміі, як сацыяльна чужы элемэнт Мандрык Пятрусь Васілёў. Належныя на яго дакумэнты былі накіраваны Менскаму Акрваенкамату і, здаецца, гэтым павінен быў скончыцца абавязак Менскага АВК, які складаўся з таго, каб выдаць Мандрыку кніжку тылаапалчэнца і ўсё. Але ў Менскім АВК знайшліся людзі, якія ўзялі яго пад сваё крылышка і ён да гэтага часу не атрымаў дакуманту тылаапалчэнца. Скарыстаўшы такім чынам момант, ён сумеў залезьці ў Менску ў „Белмясгандаль“, скрыўшы сваё сацыяльнае становішча і вобраз чужога элемэнту. Да гэтага часу Менскі АВК ніяк ня можа выдаць яму належнага дакуманту робячы штомесячна адтэрміноўку на час. пасьведчаньні, што годнасьць яго працягнута.

Цікава цяпер паслухаць, што скажа Менскі Акрваенкамат, на падставе чаго ён рабіў адтэрміноўку Мандрыку і чаму да гэтага часу ён не атрымаў дакумента тылаапалчэнца.

Свой.

Вылучэнцы заменяць вычышчаных.

(Ад нашага Полацкага карэспандэнта).

У горадзе закончылася чыстка апарату Акрстатбюро, Працкалектыву, Біржы Працы, Акрсуду, Пракуратуры і інш. Сходы праходзілі з вялікай актыўнасьцю працоўных. Вось асобы, якія пастановай акруговай камісіі ўжо вычышчаны з апарату.

ШАЎРОЎ Д. А. (Акрстатбюро). Былы дваранін, сын палкоўніка, скончыў кадэцкі корпус, служыў у белай арміі, арыштоўваўся за контр-рэвалюцыю, трымае шчыльную сувязь з братам эмігрантам, грамадзкай працай зусім ня цікавіцца.

Шалаяў І. Г. (Працкалектыў). Сын буйнага падрадчыка, пры старым рэжыме доўга працаваў па турэмнаму ведамству, быў памощнікам начальніка Струнскай палітычнай турмы, у 1921 годзе выключан з партыі, як чужды элемэнт.

Бранавіцкі (нарсьледчы). На першы раз здаецца, што Бранавіцкі ня мае за сабой асаблівых «грахоў», але на самай справе ён зьяўляецца варожым элемэнтам, вялікім падхалімам, ненадзейным у фінансавых адносінах, сыстэматычна скрыўляў клясавую лінію батракоў. Аб тым, што ён былы паручык, невядома было да моманту чысткі. Беспадстаўна заводзіў крымінальныя справы на сумленных працаўнікоў (справы Кандукова, Браўковіча і інш).

Чыстка савецкага апарату па Расонскаму раёну ўжо закончылася. У працягу цэлага месяца праз пасяджэньні камісіі прашло больш 400 чал.

У працэсе работы камісіяй было выяўлена, што засьмечаным зьяўляецца апарат лясьніцтва і лесазарыхтоўчых арганізацый, дзе старыя сабе гняздо сваякі, знаёмыя. Старшыя спэцыялісты гэтых устаноў згуртавалі вакол сябе розныя чужыя элемэнты: заможнікаў, кулакоў і інш. (Клясьціцкае л-ва, апарат шляхавага будаўніцтва).

У каапэрацыйным апараце наглядалася сваяцтва, амаль поўная засьмечанасьць складу зарыхтоўшчыкаў былымі гандлярамі, спэкулянтамі і кантрабандыстамі.

Апарат райвыканкому і сельсавету у сваёй большасьці здаровы. Усё-ж зьнята з кіраўчай працы 3 старшыні і адзін сэкратар сельсавету. З боку заможнікаў былі спробы, каб скампрамэтаваць сумленных савецкіх працаўнікоў (Круцікоўскі сельсавет).

Але пры вялікай актыўнасьці з боку працоўнага сялянства, камісіяй выяўлен твар працаўнікоў Расонскага райёну, дзесяткі варожых элемэнтаў па пастанове акруговай камісіі ўжо вычышчаны з апарату. На іх месца будуць пастаўлены новыя сумленныя працаўнікі.

Для падрыхтоўкі новых кадраў савецкіх працаўнікоў, у хуткім часе будуць адчынены спэцыяльныя курсы, разлічаныя на вылучэнцаў, якія заменяць вычышчаных.

Сьпір. Міхальцоў.

КУЛАЦКАЯ КАМІСІЯ.

(Даманавічы, Калінковіцкага райёну).

Набліжаецца чыстка савецкага апарату ўжо абрана камісія сельсаветам.

Цікава, як Даманавіцкія сельсаветчыкі на гэту важную справу паглядзелі:

У камісію ўвайшлі: **Начан Хведар**, царкоўны стараста, кулак, пазбаўлены выборчых правоў, **Бэйнсон Е.**—заможнік—прыватнік, які эксплёатуе прыватную сілу і агітуе проці савецкае ўлады.

Гэтыя кулакі агітуюць проці калектывізацыі. А сельсавет абраў іх у камісію на чыстцы.

Неабходна абраць у камісію іншых, ня чужых людзей.

Гэты.

Вон чужых людзей!

(М. Вушачы, Полацкае акругі).

Сын Гандмана, пазбаўленага выборчых праў, Гандман Изер, які ўвесь час займаўся кантрабандай, цяпер працуе ў г. Магілеве ў якасьці адказнага працаўніка ў каапэратыве.

Брат яго Гандман Язэп, былы кантрабандыст, бацькі яго ня маюць права голасу, прымазаўся да партыі і знаходзіцца ў г. Полацку, працаваў у ЦРК, цяпер працуе ў гор. Магілеве ў банку.

Селькор Крывы.

ЧАС РЫХТАВАЦЦА ДА ЗАГАТОЎКІ ХЛЕБА

ХЛЕБАЗАГАТОЎЧАЯ КАМПАНІЯ НАБЛІЖАЕЦЦА.

Добры ўраджай у БССР сёлета ставіць перад хлеба-загатоўчымі органамі і, наогул, перад шырокай Савецкай грамадзкасьцю заданьне—як мага лепей скарыстаць гэту кампанію, не паўтараючы памылак мінулага году.

Дзякуючы добраму ўраджаю, сёлета мы павінны загатовіць больш, чым у леташнім годзе. Гэта трэба мець на ўвазе, трэба выканаць перад партыяй і ўладай абавязацельства—загатовіць да 1-га студзеня 1930 году 75 процантаў агульнага заданьня.

Хлебазагатоўку мы павінны скончыць як найхутчэй па дзьвёх прычынах. Першая—гэта тое, што запасаў хлеба патрабуе наша дзяржава; другое—вольны хлебазагатоўчы апарат можна будзе потым скарыстаць на іншай працы. Наогул, расцягваньне хлебазагатоўкі шкодна—як для дзяржавы, так і для вясковай беднаты, якая летась, з прычыны дрэннай загатоўкі хлеба, экспёатавалася кулакамі, якія «ухитрились» узьняць цану на жыта да 15 руб. за пуд.

Плян нашых хлебазагатовак, а таксама і значэньне іх для дзяржавы павінны быць падрабязгова растлумачаны насельніцтву. У гэту працу мы павінны ўцягнуць увесь вясковы актыў, усю інтэлігенцыю, а галоўнейшым чынам—беднякоў і незаможных сераднякоў. Жанчыны таксама пры правядзеньні гэтае кампаніі не павінны стаяць збоку, бо, як паказала практыка мінулага году, яны з прычыны сваёй несьвядомасьці, зьяўляліся тормазам у загатоўцы хлеба.

Сёлета трэба з самага пачатку кампаніі шырока разгарнуць калектыўную здачу збожжа—праз арганізацыю чырвоных абозаў. Трэба ма... растлумачыць насельн... лета будзе прыма... толькі калектыўная зда...

Нашым хлебазагатов... пінацыям трэба загад... падрыхтаваць сяло... пункты для збожжа.

Усе гэтыя заданьн... поўнасьцю выканаць... ве, калі нашы партыйн... кія арганізацыі зьмо... навокал пытаньня хлеб... рокую грамадзкую ар... у гэту кампанію бядн... кае і бядняцкае насе...

Маючы ўсё гэта на... жам быць поўнымі, шп... ка пройдзе пасьпяхова.

Калектывы патрабуюць пільнай ув...

ДАМО АДПОР НАСТУПУ КУЛАКА НА КАЛГАС! УЗМАЦНІМ КУЛ... ВЫХАВАЎЧУЮ ПРАЦУ Ў КАЛЕКТЫЎНЫХ ГАСПАДАРКАХ!

Асушылі балота.

(Самахвалавіцкі райён, Меншчына).

Дубіцка-Слабоцкае мэліарацыйнае таварыства, Крупіцкага сельсавету да мінулага году спачатку свайго існаваньня, спала непрабудным сном. У леташнім годзе мясцовая парт'ячэйка і сельсавет узварухнулі працу таварыства. Перад перавыбарамі праўленьня былі праведзены сходы беднаты, а таксама падрыхтавалі серадняцтва, дзякуючы чаму старае, заможніцкае праўленьне, якое тармазіла і зрывала працу, скінулі і абралі працаздольнае, бядняцкае.

Яшчэ зімой праўленьнем была зроблена падрыхтоўка да працы на балоце. Асушку балота пастанавілі зрабіць да 15-га ліпеня, прычым вынесьлі пастанову на агульным сходзе пайшчыкаў—канавы рыць пароўну і касіць пароўну, хоць заможная і кулацкая частка вёскі ўпіралася ўсімі сіламі супроць такой пастановы але арганізаваная бедната і серадняцтва перамаглі.

Для прарыцьця канаў узялі крэдыту 200 руб., які разьмеркавалі сярод беднаты і інвалідаў. Канавы ўжо прарыты, плошча балота ў 30 гэктараў ужо асушана. З непраходнага і тваннага балота, куды сяляне ня пускалі жывёлы і самі баяліся хадзіць, зрабілася сухая, качкаватая сенажаць, па якой можна ня толькі прайсьці чалавеку, а нават праехаць на кані. Неабходна адзначыць вялікі ўздым і зацікаўленасьць беднаты і серадняцтва калектыўным трудом. Канавы рылі грунамі па 10—15 чалавек. Праца ідзе пасьпяхова, весела і сярод грязі паказваецца чорная як вуж і роўная канава.

Калі менш было спрэчак па разьмеркаваньні сена, вынесьлі пастанову—касіць таксама калектыўна (ад кожнага павінен быць касец). Не пасьпела яшчэ паказацца сонейка, як касцы ўжо былі на нагах і зьбіраліся каля старшыні праўленьня, каб выйсьці разам на касьбу. Праз паўгадзіны ходу трудавая армія ў 39 чалавек была ўжо ў „вуглу“ і пад дружны гоман і сьмех званіла брускамі аб косы. Рознакалёравым убраньнем сялянскай вопраткі апрануўся вугал. Ніяк няверыцца, што раней тут было непраходнае страхоцьце—грязь зарошная травой і нізкарослымі бярозкамі. У два дні балота было скошана, а праз некалькі дзён на балоце засталіся толькі адны канавы зразаўшыя яго ўдоўж і папярок.

А яшчэ будзе цікавей, як на балоце зараве ды застагне калёна трактараў, якую АРКЗА па дагавору прысылае праз некалькі дзён. Так упарты, калектыўны труд на месцы страхоцьця засявае зерне будучыны.

Райённы.

Абкружаныя соснамі і адрэзаныя...

Хмурыя, стогадовыя сосны. Яны—сымбаль старасьветчыны, эмблема дзікай вечнасьці прыроды. Ідзеш па ўзгорках, равох, абыходзіш абрывы і мёртвыя трупы дрэў, глядзіш на сонца і ня бачыш яго—загубілася дзесьці ў карунках галін. Усюды, дзе-б вы ні былі, усюды міжвольны, на падначальваецца законам прыроды. Спакойны, роўны, упэўнены шум. І меновіта ў гэтай спакойнасьці неабмежаваная моц. Яна адымае ў вас індывідуальнае „я“, і вы адчуваеце, што трапілі ў палон. Вы чулы, мяккі. Амо' і зусім паэта...

Сябры яўрэйскага нацыянальнага калектыву імя тав. Чарвякова зусім не падобны да вас. Яны—людзі практыкі. Людзі справы. Людзі—сталь. Пакінулі сёлета вясною мястэчка і прышлі на шырокія гоні палёў. О, каб на шырокія гоні палёў! Яны прышлі, і ня прышлі, а робінзонамі прасеклі сабе дарогу ў глухія месцы, за 65 кілёмэтраў ад чыгункі, кудысьці за Мазыр, за Лельчыцы, у самую гушчу сосен. Ім адрэзалі больш дзьвюх з паловай соцен дзесяцін лесу. Вы ня верыце? Абсалютна лесу. Ну, яшчэ балота некалькі дзесяцін. А поля ні кавалачка, ні пядзі. „Жыві—ня тужы, памрэш—не заплачуць“. Так сьпявалі-б гультаі—абібокі. Камунары не таго дзесятка. Яны ня людзі, а звыш—людзі: для іх ня існуе перашкод.

Не, не! Вы паглядзіце на камунараў. Праўдзівей, на выніку іх працы. Піла і сякера—інструманты, сродкі працы. Ад гэтых дзьвюх рэчаў ня вытрымлівае звонкая сасна:—спачатку заціскае, перашкаджае рэзаць, а потым пачынае дрыжэць, нахіляцца, і, урэшце, з шумам кропіцца рэха ў бары. Сякера агаляе сосны з камля і да макушкі, лакавае прыгожасьці стромкага дрэва. Гальлё аддаюць у ахвяру Аллаху, а струну-бервяно плотнікі вязуць на сялібу.

Ляды цярэбяць сякерамі. У зямлі сякера тупіцца—ідзе на дапамогу вага. Закладуць яе, вагу гэтую, пад самае сэрца карча, налягуць чалавек 5-6 на канец, націснуць і корч стогадовы яшчэ мацней ухопіцца за другія карэньні, за ўсю зямную кулю, але закрэкча, нахінецца і на бок ляжа.

На расьцярэбленых лядах сеяць ярыну. Як шпарка ператвараецца твар зямлі! Сёлета вясною арганізавалі калгас, вясною расьцерабілі лес і вясною засеялі трыццаць гэктараў ярыны. Сьпее ячмень, шуміць пшаніца, набухае бульба і франтаваты гарох.

Гэта фантазія? Не, гэта сэ... Гэта рэчаіснасьць нашых дн... на гарбузы, што мяшчаніны... ліся на градках, і больш... чынаеш паважаць чалавека... чалавека працы, а чалавека... Ёсьць людзі і ёсьць звыш... віта яны, звыш людзі, пад... баразну ў палескія дубы-гі... новыя пушчы і журавіны... навіта іх моц зьнішчала... ціла калосьці аўса.

Але надыходзе ноч. Чорна... балотная. І туманы сьпяе... нах, і машкара насыпае... хтосьці ярыну топча—... хтосьці, а кулакі вакольны... лянцы, Стары Фальварак... табунамі коняй на пашчыну... ідуць з сакавітай травой. Ня... калгасу, ня хочуць, каб... джалі балотную ціш і куліс... загаджаюцца, што поцеч з... дуюць гаспадарку. І выбіваю... пасевы. Помсьнець камуністы... уладзе, калгасу. Усім.

Ноч зьмяняецца днём, і... кага наступу набывае іншы... стухі не глядзяць за жывёл... на пасевы. Знарок заганоюць... І самі гаспадары прыводзяць... да палёў калектыву—ідзеце... даеце,—а самі хаваюцца за... вёла ходзіць па ярыне, а зб... —пагражаюць. Нядаўна хаяе... ледзь выратаваліся ад сме... уцяклі. Юхмана Б. зьбілі каля... палёў, працы і самога сябе. З... навалі, каму працавалі?

Хадзілі ў Лельчыцы, прасілі... міліцыі. Белабрысы агент... груба адказаў:—„Пакуль я ж... кіх параненьняў, ніякіх мер... буду і нікога туды не пашлю... джаў смуглявы інструктар... і той казаў, што гэта „дробны... шчы і дробныя дробязі“.

Куды пайсьці? Каму скаргі...

той-жа са сне, што з громатам... зямлю. Не таму-ж белабрысаму... ня смуглявому баравіку.

Камунары абкружаны соснамі—кулакі. У кулакоў—... рэзах—кулі трапныя, сьмяротны...

Адзін называе гэта „дробны... зямі“, другі чакае „цяжкіх пар... а трэці тым часам сушыць пор...

Шм. Зар...

Узьнялі ўраджай.

(Журавіцкі р., Магілеўскай акр.)

Рэарганізаваная калектыўная гаспадарка ў больш буйную ў 1928 годзе прыняла назву „імя Сталіна“.

Калектыўная гаспадарка зараз налічвае ў сваім складзе 15 гаспадароў з лікам 78 чалавек, мае ўсёй плошчы 213 гэктараў, з якой пахаці 90 гэктараў, глеба апустошаная, ня добрай якасьці, але-ж можна адзначыць і посьпехі праводзімай працы па ўзмацненьню эканомікі гэтага калектыву.

Прывядзем асобныя галіны росту гэтае гаспадаркі: з 16 буйных кароў да 36, з якіх палепшанай пароды 15 штук; з 6 штук маладняка да 31 штукі; маецца 1 бык вытворнік; маецца пітомнік пародзістых сьвіней з лікам—сьвіней 5 штук, з якіх два кныры. Коняй зараз маецца рабочых 15 штук, а было 11, маецца 3 штукі маладняка (раней ня было). Авец налічваецца 75 штук, здабыт 1 баран-вытворнік. Пабудавана дзьве хаты, будуецца дом з разьліку на 5 сямей, адбудавана лазьня, агульная канюшня, скотны двор, адрамантавана 2 хлявы, 1 гумно.

Калі раней дзесяціна давала 45 пуд. жыта, то зараз дае 75 пудоў,—аўсу атрымоўвалі з дзесяціны—45 пудоў, зараз 75 пудоў, бульба—750 пудоў. Ячмень і грэчка таксама даюць значнае падвышэньне, Чаму-ж такі значны скачок у бок павялічэньня дае глеба? Гэта таму, што калектыў у асеньняю пасеўкампанію прыняў усе крокі да скарыстаньня агранамічных парад: куплена 100 вазоў гною, 100 пудоў попелу, ужыта зялёнае і штучнае ўгнаеньне, ачышчана ўсё насеньне.

Калектывам закантрактавана 10 гэктараў аўсу, 20 гэктараў бульбы, 4 гэктары канюшыны, 3 гэктары лубіну, 1 гэктар лёну. Пашырана пасеўная плошча за лік 15 гэктараў ляд. Такім чынам павялічэньня маецца на 15 проц.

Неабходна ... агульнай пахаці. ... што гэтая калектыўная ... такім малым ураджаі мінулага ... здала каапэрацыйным арганізацыям ... пудоў аўсу, 120 пудоў жыта, ... грэчкі, каля 3000 тысяч пудоў ... 20000 пудоў сена і ў гэтым годзе ... ма намецілі здаць усе ліцы.

Калектыўная гаспадарка ... ляцца прыкладнай сярод ... сельніцтва. Калгас аказвае ... наце, запахалі адной удаве ... новую кампанію і зараз выма... еньне бедняку. Маецца зна... цяга вакольных двух паселкаў ... Рэпінча; але-ж тормазам у ... ёму зьяўляецца тое што калектыў ... тага часу ня можа дачакацца ... каб земляўпарадкаваца і ... жадаючыя паселкі. Гэта сама ... перашкода ў працы калектыву.

Недахопам прыходзіцца ... належнай культурна-выхаваўчай ... не праводзіцца, як сярод сяброў ... дзяцей, адсутнічае чырвоны ... арганізован гурток лівідацыі ... насьці (а нянісьменных лічыцца ... тыве 15 асоб). Гэтым пытаньне ... недастаткова цікавіцца мясцовая ... і ня было належнае дапамогі ... культаддзелу РВК. Маецца недах... ска-гаспадарчых машын, асабліва ... вай радавой сеялкі, якая патрэбна ... гаспадаркі. Агульны сход сяброў ... заўся абавязкова на будучы год ... трактар. Зараз калектывам пра... падрыхтоўка да асеньняй кампа... ўборкі ўраджаю. Райвыканкому ... больш зьвярнуць увагі дапамогі ... тыўнай гаспадаркі, а галоўнае, ... рыць за лік двух паселкаў і ... радкаваць.

Шчаслі...

Наладзім культпрацу ў калгасах.

Буйны рост калектыўных гаспадарак за апошні час вельмі разыходзіцца з пастаноўкай культурнай працы ў іх.

Мы наглядаем, напрыклад, такія зьявішчы, што сяляне да арганізацыі калгасу выпісвалі больш газэт. Калі яны аб'ядналіся ў калгас, то і пачалі калектыўна выпісваць газэту. Замест 10 экз. «Бел. Вёскі» яны абыходзяцца адным.

Вядома, пры ўмове калектыўнай чыткі гэта добра. Але трэба за лік скарачэньня экзэмпляраў аднаго выданьня выпісваць другія выданьні. Чаму, да рэчы кажучы, ня выпісваць калгасу „Бедноту“, часопіс „Коллективист“, „Савецкую Беларусь“, «Зьвязду».

Партыйна-савецкія арганізацыі вёскі не зварачваюць сур'ёзнай увагі на культурнае жыцьцё калгасаў. Замест таго, каб зрабіць калгас культурным асяродзьдзем вёскі, яны праводзяць культпрацу так сабе, наогул, для сілян, для ўсёй вёскі.

Неабходна і тут мець класавае ... межаваньне. Вельмі пажадана ... агранома, даклад, спэктакль, ... водзіць у самым калгасе, запрашаць ... туды сялян. Гэтым самым сяляне ... дуць мець мажлівасьць больш ... на азнаёміцца з жыцьцём калгасу, ... вучыць асобныя галіны гаспадаркі.

Неабходна зрабіць пералом у ... пытаньні.

Буйны рост калгасаў непавінен ... раджаць культпрацу ў калектыўных ... гаспадарках.

Больш дакладней кажучы, ... на ўзмацніць культпрацу ў калгасах, ... зьвярнуць на яе больш ... увагу.

Калгас неабходна зрабіць буйным цэнтрам вёскі, асноўным ... ным пунктам культасьветных, ... ных і савецкіх арганізацый.

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ.

Бяз моцнай, пабальшавіцку загартаванай у клясавых бойках камуністычнай партыі, без свайго неабмежавана адданага пралетарскай рэвалюцыі баявога авангарду пралетарыят ніводнай краіны ня здолее давесьці рэвалюцыю да пераможнага канца, ня здолее атрымаць канчатковую перамогу над буржуазеяй.

Гэты факт пасьля тысяч памылак зразумеў сусьветны пралетарыят. І, зразумеўшы, дзейна распачаў скалачваньне ў сябе гэтага неабходнага дзеля перамогі авангарду—камуністычнай партыі.

Але ня толькі пралетарыят зразумеў гэты факт. Зразумела яго і сусьветная буржуазея, у прыватнасьці, буржуазея француская.

Няўхільна ўжо цэлы шэраг гадоў імкнецца яна паралізаваць волю свайго пралетарыяту да барацьбы, імкнецца пазбавіць яго баявога штабу, яго кіруючага цэнтру, яго авангарду—КПФ.

З прыходам да ўлады ў Францыі ў асобе Пуанкарэ буйнага капіталу, з прыходам да ўлады магнатаў цяжкай індустрыі, гэта барацьба супроць камунізму, супроць францускай кампартыі, прыняла асабліва вострыя формы.

Нясупынна ліліся патокі брудну на галовы кіруючых кадраў францускіх камуністаў.

Бульварная, прадажная прэса Францыі, пачынаючы ад рэакцыйнай „Матэн“ і канчаючы „сацыялістычным“ ня менш бульварным, чымся „Матэн“, „Пантюлер“,—бульварная прэса Францыі, як па камандзе, пачала выдумляць розныя „камуністычныя змовы“, чым далей, тым больш бязглуздыя.

І ўсе як адзін з пенай крычалі:

— Францускія камуністы прадаліся Маскве. Яны вядуць у нас работу, якая аплачваецца бальшавіцкім золатам. Яны шпіёняць у карысьць саветаў.

І разам у адзін голас:

— Абвясьціць кампартыю па за законам. Закрыць камуністычную газэту „Юманітэ“. Засадзіць у турму, выслаць на Гвіяну дэпутатаў-камуністаў, правадыроў францускага пралетарыяту.

Мэтадычна, упарта стаўленікі францускага буйнага капіталу—Пуанкарэ, начальнік паліцыі Шнап і іншыя пачынаюць свой паход на францускую кампартыю.

Адзін за другім штучна ўтвараюцца „камуністычныя змовы“ і „шпіёнскія працэсы“. На баявы орган францускай кампартыі—на газэту «Юманітэ» ляцяць, як з «рога изобилия» шматлікія штрафы, камуністычных дэпутатаў і правадыроў арыштоўваюць і садзяць у турму, прысуджаюць на шмат гадоў зьняволеньня.

Разам з гэтым вядзецца і арганізаваная барацьба з рабочай клясай. Заможныя рабочыя, якія зьяўляюцца членамі кампартыі або членамі рэвалюцыйных прафсаюзаў (органаў пакуль што зусім легальных), або якія прымаюць удзел у забастоўках і дэманстрацыях,—гэткія рабочыя арыштоўваюцца і ў 48 гадзін высылаюцца з межаў «дэмакратычнай» францускай рэспублікі.

Перад кожнай камуністычнай дэманстрацыяй—маніфэстацыя ў Вэнсэне, маніфэстацыя ў абарону Сако і Ванцэці, маніфэстацыя 1 мая і г. д.—француская паліцыя пад асабістым кіраўніцтвам прэфэкта Шнапа арганізуе літаральна паляваньне на камуністаў. Яна арыштоўвае бяз усялякай, нават з пункту погляду буржуазеі, законнай падставы камуністычных правадыроў і кідае іх у турмы. Яна бязьлітасна зьбівае і арыштоўвае радавых рабочых.

НА ШЛЯХОХ БУДАЎНІЦТВА НОВАЕ ШКОЛЫ.

Удзел асьветнікаў у правядзеньні дню індустрыялізацыі.

[illegible] індустрыялізацыя краіны і рэканструкцыя сельскае гаспадаркі [illegible] на больш высокай тэхнічнай базе ва ўмовах клясавае барацьбы ўнутры краіны і капіталістычнага акружэньня СССР выгнае ад пралетарыяту і ўсёй працоўнай грамадзкасьці ўпартае працы ў гранозе цяжкасьцяў, якія сустракаюцца на шляху сацыялістычнага буйніцтва. Пастановы партыйных зьездаў, пленумаў ЦК і ХУІ партканфэрэнцыі аб індустрыялізацыі краіны і капітальных укладаньнях у прамысловасьць з мэтаю дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны—патрабуе напружанай працы кожнага працоўнага ў ўсіх галінах гаспадаркі. Пралетарыят зразумеў паставленыя перад ім гістыяй задачы і зьяўляецца першым заваўніком ажыцьцяўленьня вялікіх задач сацыялістычнае перабудовы нашае краіны.

Шпаркі рост нашае прамысловасьці актывізуе пралетарыяту ў перадовае і умацаваньні нашае краіны клікае таленства з боку буржуазеі, ал розными шляхамі імкнецца перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву. На ўсе перашкоды з боку буржуазеі пралетарыят СССР, пад кіраўніцтвам ВКП(б) зварочвае яшчэ большую увагу на больш пасьпяховае правяньне і забясьпечаньне ажыцьцяўленьня 5-цігадовага пляну сацыялістычнай рэканструкцыі. Па прапанове ЦК партыйных, саюзных і савецкіх арганізацый з мэсц ЦК УсеКП(б) пастанавіў зрабіць 6 жніўня днём індустрыялізацыі, які павінен зьвяціца аглядам дасягненьняў пралетарыяту ў барацьбе за павялічэньне працоўнае дысцыпліны, за лепшую якасьць прадукцыі, за індустрыялізацыі і накапленьне і г. д.

Бязумоўна, што з высунутымі задачамі больш лёгка справіцца пралетарыят пры актыўнай дапамозе шырокіх мас працоўнага сялянства. У зьвязку з гэтым перад вясковымі асьветнікамі стаіць надзвычайна вялікая задача. Гэта задача ставіць перад сабою мэту шырокага азнаямленьня працоўнага сялянства з 5-цігадовым плянам будаўніцтва, з задачамі рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і практычнага правядзеньня падніскі сярод насельніцтва на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Адозва УсеЦСПС аб 100 проц. падпісцы атрымоўваемай пэнсіі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі павінна ня толькі знайсьці шырокі водгук сярод асьветнікаў, але асьветнік павінен задацца мэтаю прасунуць у кожную хату аблігацыю 3-й пазыкі індустрыялізацыі.

Вынікі распаўсюджаньня 2-й пазыкі індустрыялізацыі паказалі, што частка асьветнікаў зусім ня ўдзельнічала ў гэтай вялікай справе і ў большасьці падпіска ўтваралася на ня поўную пэнсію.

Гэта гаворыць за тое, што ня кожны дастаткова зразумеў вялікае значэньне дзяржаўных пазык у справе індустрыялізацыі краіны.

Дзень індустрыялізацыі і ў асьветніцкіх шэрагах павінен быць днём падвядзеньня нашых вынікаў удзелу ў індустрыялізацыі краіны, падвядзеньня вынікаў нашага ўдзелу ў перабудове і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, а таксама днём правядзеньня ў жыцьцё пытаньняў культурнае рэвалюцыі.

Асьветнік.

Палітасьветныя ўстановы ў асеньнюю пасеўную кампанію.

Распачынаецца гарачая праца для сельскае гаспадаркі—прыбіраньне ўраджаю і падрыхтоўка да асеньняга севу.

Вясковым палітасьветным установам трэба зьвярнуць максымум увагі і прыняць самы актыўны [illegible] у правядзеньні гэтае надзвычайна важнае гаспадарчае кампаніі.

Напершае, трэба шырока разгарнуць працу па дапамозе бяднейшаму насельніцтву ў уборцы ўраджаю. Некаторыя з беднякоў ня маюць патрэбных с.-гасп. машын, прылад, коняй, і частка (сем'і чырвонаармейцаў) і рабочых рук. Усе гэтыя моманты хатычытальні павінны своечасова ўлічыць і разам з с.-саветамі і камітэтамі ўзаемадапамогі арганізаваць належную дапамогу, прыцягнуўшы да гэтага калгасы, саўгасы і серадняцкія гаспадаркі. Адначасова з гэтым шырока павінна быць разгорнута падрыхтоўчая кампанія да своечасовага асеньняга севу.

Праз правядзеньне з сялянамі гутарак, дакладаў, лекцый і іншае агітацыйнае і практычнае працы хаты-чытальні павінны дабіцца таго, каб бяднейшым насельніцтвам і сераднякамі своечасова было падрыхтавана насеньне і ачышчана, своечасова падрыхтавана і пашырана плошча засеву і ўжыты іншыя агрыкультурныя мерапрыёмствы.

Пры гэтым усім хатам-чытальням ня трэба забываць, а цьвёрда кіравацца і дамагацца поўнага выкананьня пастаноў **партыі і ўраду аб падвышэньні ўраджайнасьці і ініцыятывізацыі.**

Працу па правядзеньню гэтае кампаніі трэба распачаць зараз-жа наладзіўшы цесную сувязь з сельсаветамі, камітэтам ўзаемадапамогі і ячэйкамі КП(б)Б і ЛКСМ, а таксама згуртаваўшы для дапамогі актыў.

На час кампаніі неабходна шырока разгарнуць даведчую працу. Праз даведчыя сталы хата-чытальня павінна растлумачыць селяніну (бедняку, серадняку) дзе здабыць лепшыя гатункі насеньня, дзе ачысьціць насеньне, як купіць сельска-гаспадарчую машыну, арганізаваць калгас, арцель і г. д.

Разам з гэтым шырока трэба павесьці працу па прасоўваньню масавае сельска-гаспадарч. літаратуры выкарыстоўваючы для гэтага кніжныя выстаўкі, кніганош і рэкамэндацыйныя сьпісы.

Асеньняя пасеўкампанія павінна знайсьці поўны адбітак і ў насьценнай газэце, зьместу якой прыдзецца надаць кампанейскі характар. Нельга заставіць у баку і сельска-гаспадарчыя гутаркі, якія павінны быць застрэльшчыкамі арганізацыі калгасу і правядзеньня ўсіх агрыкультурных мерапрыёмстваў. Наогул хаты-чытальні павінны выкарыстаць для правядзеньня с.-г. кампаніі ўсе віды масавае палітасьветпрацы, дамагаючыся практычных вынікаў па выкананьню высунутых задач партыяй і ўрадам.

М. Сеўрук.

Хімізацыя школ.

У свой час у «Савецкай Беларусі» паведамлялася аб аглядзе выкладаньня хіміі ў навучальных установах г. Менску, які пачала праводзіць хіміка-навукова прамысловых сэкцый ЦС Асоавіахіму БССР. Зараз ужо магчыма казаць аб выніках агляду. Былі дасьледаваны ўсе тыпы навуковых устаноў. АБВШ, рабфак, прафшколы, тэхнікумы, агульна-асьветныя курсы, дзевяцігодкі, сямігодкі радавыя і практыкавальна-паказальныя пры пэдтэхнікумах і Пэдфаках БДУ, школы для дарослых узвышанага тыпу і інш. Сьцьвердзілася, што выкладаньне хіміі знаходзіцца ў цяжкіх умовах. Было знойдзена цэлы шэраг недахопаў, у тым ліку і лёгка выпраўляемых, але вельмі нянрыемных. Высьветлілася, напрыклад, што АкрАНА адпушчаў некаторыя сродкі на абсталяваньне, але даваў крэдыт на такую арганізацыю (кнігарня БДВ), дзе гэтага абсталяваньня няма, загэтым школы не маглі выкарыстаць свае грошы і набыць належнае абсталяваньне. Загадчыкі некаторых школ бяруць сабе тыя гадзіны, якія павінны былі-б ісьці ў аплату за кіраваньне хімлябараторыямі выкладчыкамі хіміі. Асабліва дрэнна пастаўлена праца ў тых навучальных установах, якія знаходзяцца на самаапладзе, як напр., агульна-асьветныя курсы. Высьвятляецца недахоп часу для апрацоўкі праграм актыўнымі мэтадамі, а НКА Беларусі не зварачвае на гэта належнае ўвагі.

Нядаўна ўсебеларуская нарада працаўнікоў пэдтэхнікумаў прыняла пастанову аб павялічэньні ліку гадзін для хіміі на 2 гадзіны для ўзмацненьня лябараторных праў, а Мэтадком на гэта не зважае. Недастаткова прапрацаваны праграмы, адсутнічае арганізацыя, якая аб'ядная-б выкладчыкаў хіміі для абгаварэньня мэтадычных пытаньняў, бо існуючыя ўмовы працы нават добра падрыхтаваных выкладчыкі — дэкваліфікуюцца. Мала зьвернута ўвагі ў школах на ваенную хімію, дрэнныя падручнікі, вельмі вялікая нагрузка выкладчыку не дае ім прадукцыйна працаваць, мэта працы зьяўляецца пасыўнаю, мала разгорнута асоавіахімаўская праца. Але ўсё-ж адзначаецца некаторы рост, павялічылася цікавасьць да хіміі ў зьвязку з адчыненьнем хіміка-тэхналёгічнага факультэту пры БДУ, хімтэхнікума і г. д. Сэкцыя намеціла цэлы шэраг мерапрыёмстваў, якія павінны палепшыць працу.

Даручана скласьці на падставе матар'ялаў падрабязную запіску, у якой будуць пералічаны ўсе недахопы і меры, неабходныя да зьнішчэньня іх. Трэба толькі каб Наркамасьветы, АкрАНА і інш. адпаведныя арганізацыі ўважліва аднесьліся да гэтай працы, а не адмахваліся ад яе, як гэта бывае часамі зараз.

П. Б.

Яшчэ аб зямельных вучастках пры школах.

Узьнятае на старонцы газэты „С. Б." пытаньне аб школьных агародах заслугоўвае ўвагі як з боку мясцовых, так і цэнтральных арганізацый.

Да гэтага часу амаль пры ўсіх школах, школьныя зямельныя вучасткі, аб якіх так многа гаварылася, не зьяўляюцца насіцелямі аграпрапаганды на вёсцы.

Яны ня зьяўляюцца праводным рэмнем праз школу да працы на сельскай гаспадарцы.

Вучням не прывіта любоў і зацікаўленасьць працаваць на с.-г. Кожны вучань так і думае, скончу школу і пайду далей вучыцца, або стану дзе працаваць, толькі не на сельскай гаспадарцы.

Насельніцтва на гэты школьны вучастак глядзіць, як на зямельку, якую павінен сам настаўнік скарыстаць або здаць у арэнду. Адным словам настаўнік па школьным зямельным вучастку не паказаў насельніцтву нічога прыкладнага—паказаўчага, а таксама і вучням, якія-б што небудзь змаглі ўжыць у сваёй гаспадарцы.

Ды яно і поўна што настаўнік пры своім жаданьні ня можа поўнасьцю зрабіць таго, што належыць за адсутнасьцю сродкаў і без грамадзкай дапамогі.

Нельга абыйсьці маўчком такія школы якія больш-менш рацыянальна скарыстоўваюць свой вучастак, але іх вельмі мала, і большасьць паказаўчага толькі на агародзе. Прыкладам узяць Шклоўскі раён. Пры 45 школах ёсьць зямельныя вучасткі ад 2 да 5 гэктараў зямлі. З гэтых школ толькі пяць не аддаюць свой вучастак у арэнду, а скарыстоўваюць самі, не адрозьніваючы ад кожнага гаспадара-селяніна.

Ёсьць моманты дзе гэты вучастак ня хочуць браць у арэнду, таму што зямля пустая. Але-ж ёсьць Чарнаруцкая школа пры якой ёсьць школьны агарод на якім настаўнік разьвёў пітомнік пладовых дрэў.

Вясною і восенью ўсе вучні ста рэйшых груп на практыцы навучаюцца, як разводзіць дрэвы. Многіх вучняў, а таксама і сялян настаўнік навучыў, калі і як загатаўляць насеньне.

Вынікі гэтае працы відны. Шмат ёсьць паказаўчых пітомнічкаў у сялян. З усяго гэта ўзьнікае пытаньне аб мэтазгоднасьці трыманьня ад 2 да 5 гэктараў зямлі пры школе. Ня лепш было-б прырэзаць школе 0,75 гэкт. для агароду, на якім пры меншых сродках можна большае зрабіць.

А калі заставіць школьны зямельны вучастак пры школе дык патрэбна па першае, у каптарыс унёсьці хоць малую суму грошай на паляпшэньня апошняга і, падругое, усім арганізацыям вёскі дапамагаць настаўніку зрабіць тое, што патрэбна.

На гэтае пытаньне неабходна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу, як мясцовым органам, так і цэнтральным.

Р.

Школа-сірата?

(В. Козьзе, Рэчыцк. р., Гомельшчына).

На 200 сялянскіх двароў в. Козьзе ня было будынку для школы. Зусім зразумела, было жаданьне вёскі выкарыстаць пад школу стары будынак э панскага маёнтку „Антопаль». Будынак гэты, крыху падгніў, без вакон, без дзьвярэй, страха зусім гнілая і ён патрабаваў ня менш 2 з пал. тысяч рублёў для прыстасаваньня яго пад школу. Але наяжджаючыя час ад часу прадстаўнікі Рэчыцкага РВК, ня маючы ў вёсцы нават прытулку для сходу грамадзян, намаўлялі грамадзкасьць вёскі выкарыстаць гэты паўразбураны панскі будынак пад школу, абяцаючы грашовую дапамогу з боку РВК.

Сваімі сіламі і сродкамі будынак быў разабраны, перавезены і ўсё лета і восень складаўся і дабудоўваўся ў парадку прымусовай трудавой павінасьці. Кожнаму гаспадару прышлося адпрацаваць 5-6 дзён, ня лічачы падвод і выплаты самаабкладаньня. Сродкаў не хапіла. Ня гледзячы на ўсе нашы просьбы аб дапамозе, РВК даў толькі 100 руб., 60 дошчак і кала 15 дрэў дубу і вольхі з гэтага-ж пэнтку, у той раз як адна страха каштавала больш 300 руб. Без дапамогі РВК вёска з бядой папалам аблаціла адну клясу, у якой вяліся заняткі ў дзьве зьмены з 94 вучнямі, а па вечарох з дарослымі няпісьменнымі і малапісьменнымі. Але скора працаваць у школе стала немагчыма, холад лез праз сьцены. Тады РВК у студзені г. г. даў яшчэ 100 р., але і гэта падачка мала дапамагла. Неабходна шалёўка і тынкоўка гэтага старага будынку. У клясе замярзалі вада і атрамант, мерзлі і хварэлі вучні і настаўнікі. Пры рэвізіі школы ў красавіку месяцы рай інспэктар канстатаваў, што гэта ў такім стане ня школа, а хлеў. Дзякуючы гэтаму, праца не дала жаданых вынікаў.

З пачаткам вясны паўстала рубак пытаньне аб дабудове школы. Па складзенаму папярэдняму каштарысу дабудова патрабуе 2000 руб. Вёска правяла самаабкладаньне на 500 руб. але надалей справа зноў ускладняецца. Рэчыцкі РВК ізноў ад грашовай дапамогі адмовіўся. Дзякуючы гэтаму, у сялян «не хапае пораху ў парахавіцы», энэргія пала, будаўнічая камісія ад сялян адмовілася надалей працаваць. Зьяўляецца нездавальненьне на РВК, што ён ня выконвае ранейшых абяцанак. Чуюцца галасы „што другім багацейшым, адносна, вёскам будуюць пляпавыя школы па 16000 руб. і рамантуюць іх, а нас беднякоў кінулі бяз усякай дапамогі, каб мы самі 5 год працавалі над пабудовай школы. Хіба наша школа і наша вёска сірата бясьпрытульная"?

Казінскі.

Дзіцячы прыёмнік т-ва „Прыхільнік Дзяцей".

Іх звыш 70. З рынкаў, з вакзалаў, з вуліц сабраліся сюды. Сабраліся дзеля таго, каб праз прыёмнік зьвярнуцца к здароваму, сытаму бяз вошай, бяз бруду, працоўнаму жыцьцю.

Тры кіраўнікі—жанчыны і Загадчык мужчына. Вось тыя „чарадзеі", якім даручана зрабіць з гэтых выхаванцаў вуліцы карысных, патрэбных для справы сацыялістычнага будаўніцтва людзей.

Задача—ня з лёгкіх. Цяжкасьць яе надзвычайна павялічваецца няўважлівымі, нячулымі адносінамі адпаведных ворганаў да прыёмніку. На 70 з лішкам чалавек ледзь-ледзь набярэш 40 ложкаў. Сьпяць і на ложках, і пад ложкамі, і на сталох, і пад сталамі. „Ня прывыкаць стаць бяспрытульныя". Не хапае бялізны. Няма двара, фізкультурных прыладаў для гульняў і спорту. Няма патрэбнай літаратуры.

„Занікаўленыя" гаспадарчыя кіраўнікі тлумачаць гэта адсутнасьцю сродкаў. Злыя языкі выяжджаюць нарэжыме эканоміі.

Мы схільны згадзіцца з першай прычынай: вінавата адсутнічаньне, толькі, калі ласка, ня—грошай, а—ўсьведамленьня ўсёй сугуба палітычнай важнасьці справы барацьбы з бяспрытульцем. Пры наяўнасьці такога асьвятленьня можна было і трэба было знайсьці калі ня грошы,—фізкультурную пляцоўку, літаратуру, розныя прылады.

Пастаноўка работы?—У параўнаньні з мінулымі гадамі, ёсьць бязумоўныя паляпшэньні.

Прыёмнік утрымаў у сваіх сьценах 100 проц. дзяцей, чаго ў мінулыя гады ня мелі: разьбеглися.

Ёсьць свая насьценгазэта, лёзунгі, пісаныя „своею ўласною рукою". Але настаноўка работы на сягоньня прымушае нас гаварыць аб ёй.

Камісія акрпрацасьветы, якая працавала апошні тыдзень у прыёмніку, прышла, я-б сказаў,—к досыць жудасным вынікам.

Праца—пакараньне.

Тэарэтычна, на словах прыёмнік зьяўляецца глашатаем працы, любові да яе, а на справе—паставіў знак роўнасьці паміж працай і пакараньнем. За тыя, ці іншыя дрэнныя ўчынкі дзяцей афіцыйна, „з поўным усьведамленьнем сваёй пэдагагічнай правасьці" кіраўнікі даюць работу на абслугоўваньню прыёмніку.

„Наряд -вне очереди"—безапэляцыйна заяўляе кіраўнік - „выхавацел". І выконвае дзіцёнак гэты тройчы праклятушчы „наряд", жадаючы, як мага хутчэй,—зб'явіцца ад гэтай асобы, крыніцы прыемнасьці.

Два лягеры.

Маленькі самаабслугоўваемы і самакіруемы працоўны калгасік—прыемнік кідаецца ў вочы, выдзяляецца сваёй рэзкай двухлягернасьцю: З аднаго боку—кіраўнікі-адміністрацыя, якой пакладзена па штату загадваць, даваць „наряды вне очереди", ставіць на від, рабіць вымовы, вартаваць, каб дзеці не пабілі чаго і каго—і з другога—дзеці, выхаванцы, якія павінны быць наслухмянымі (праўда, яны тут ня надта стараюцца) слухаць, што ім загадваюць. Кіраўнікі, што ім скажуць, яны падслухоўваюць, што аб іх па сакрэту гаворыць адзін аднаму кіраўнік.

А падслухоўвань—то яны ўмеюць! Сыстэма прыёмніку з яе сакрэтамі іх навучыла падслухоўваць.

А зробленыя імі ў кожных дзьвярох дзіркі як нельга лепей дапамагаюць ім у гэтым.

Добрая, лёгкая для дзяцей сыстэма! Ня трэба зусім самім рэагаваць на той ці іншы ўчынак іх таварыша. К чаму гэта? А кіраўнік на што? А традыцыйны „наряд вне очереди",—хіба ён перажыў сябе?

— Не, даражэнькія, памыляецеся: „курилка жив" і зусім яшчэ ня мае намеру паміраць.

„І без ашчаднай касы можна абыйсьціся".

Значная частка дзяцей працуе ў майстэрнях. У некаторых хлапцоў водзіцца па 5, а то і болей рублёў. Здаюць у ашчадную касу?—пытаеце вы. Становяцца ўдзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва?—„А ранец"!..—Хіба ў кухаркі, альбо ў загадчыка кіпеняў няма? Захаваюць ня горш, чым ваша сацыялістычная каса. Здаюць усе нухарцы, загадчыку, кіраўніцам, (каму хто на сэрцу прыдзесьца) і носяць тыя дзіцячыя грошы, лічачы гэта сваім доўгам, абавязкам.

„Цэнзар".

Вы цікавіцеся, ці ёсьць там рэгулярная насьценгазэта, ці разгорнута самакрытыка?

— А як-жа—ёсьць. Абавязкова ёсьць. Нават болей, чым у звычайных нармальных дзіцячых дамох. Усё, як кажуць,—чын-чынам: і рэдкалегія, і насьценгазэты, і нават цэнзар.

Цікавіцеся, хто ён такі, гэты цэнзар і што ён робіць?

Звычайная сьмяротная кіраўніца, якая прымае ад дзіцячай рэдкалегіі заметкі, носіць спачатку ў кішэні, потым прагледзіць, потым скажа:—„гэта заметка пойдзе, гэта не, а вось гэту ты, сьцянкор № перапішы вось так, гэта выкінь, а гэта спакінь!"

Піанэраў—і паху няма.

Цікавіцеся, як жа тут з піанэррухам? У чым заключаецца ўдзел і дапамога прыемніку з боку гарпіянэрбюро, гаркамолу? Прабачайце!—ні ў чым. Гарпіянэрбюро і без таго работы хапае: трэба кіраваць, упраўляцца з нармальнымі дзецьмі, у каго ёсьць бацькі, школа, а гэта—бяспрытульныя, „блатныя". Няхай дзякуюць, што кормяць іх. І ў выніку бяспрытульныя, выхаванцы прыемніку толькі ведаюць, што ёсьць піанэр-рух, ёсьць піанэры, з якімі займаюцца, якім удзяляе ўвагу савецкая грамадзкасьць.

А. Кужалеў.

Хата-чытальня на замку.

У той час, калі хата-чытальня зьяўляецца культурным асяродкам вёскі, наша хата-чытальня на замку. У хаце-чытальні гразі на калена, газэты раскіданы—на стале, вокнах, шафе—усюды можна ўбачыць згэмтаныя кучы папер. Што-ж робіць хатач Жукавец? Сьпіць. Ключоў у яго няма, яны ў камсамольца і калі папытае хто-небудзь—Жукавец кажа—ключоў няма.

Вясною было ўстаноўлена радыё ў клюбе, якое папрацавала 3 м цы і замоўкла. Маўчыць яно і да гэтага дню. Можа-б прачнуўся хатач, палепшыў працу, бо сялянства і моладзь даўно чакае.

Тутэйшы.

Пара пачысьціць такіх грамадзянаўцаў.

(гор. Жлобін).

Яндоўскі—выкадчык грамадзянаўства з жлобінскай чыгуначнай школы, нядаўна скончыў савецкую ВНУ і лічыць сябе чырвоным настаўнікам. Вядома, што ад яго патрэбна было-б чакаць шмат чаго карыснага, як для школы, так і для савецкай грамадзкасьці, але на справе Яндоўскі выглядае зусім іншым. Галоўнейшае ў яго ня школа і грамадзкая праца, а гарэлка. Вось толькі некалькі фактаў. На таварыскую настаўніцкую вечарынку ён зьяўляецца пад «мухай», ды яшчэ пра запас прыносіць бутэльку ў кішэні. Перад „вялікаднем", калі ўсе сумленныя настаўнікі гораду абвясьцілі вайну супроць вялікодных п'янак, а вучні з лёзунгамі і плякатамі дэманстравалі і заклікалі да цьвярозага быту сваіх бацькоў, „чырвоны" настаўнік Яндоўскі разам з абывацелямі стаіць у вялізарнай чарзе за бутэлькай і разбурае працу сумленных настаўнікаў. Калі мясцком выносіць яму ганьбу за такія паводзіны, ён падымае крык і заяўляе: „Я піў і піць буду і ніхто мне не забароніць, я піў нават з сябрамі ЦК». На лекцыі ў школе Яндоўскі часта зьяўляецца таксама „пад мухай" і нават былі выпадкі, калі ён пад уплывам жывіцельных капель засынаў на лекцыях. У вучняў увайшло ў звычай «нюхаць» настаўніка па прыходзе ў клясу і вялічаць яго „алкаголікам". Грамадзкай працай гэты „чырвоны" настаўнік ня цікавіцца, калі аднойчы яму даручылі прачытаць лекцыю ў рабочым клюбе, ён яе сарваў, за што рабочыя былі надта абураны. Вось як «чырвоны» настаўнік Яндоўскі дапамагае перабудове нашага жыцьця.

Ж. і Ч.

Удзел асьветнікаў у правядзеньні дню індустрыялізацыі.

[illegible] індустрыялізацыя краіны і рэканструкцыя сельскае гаспадаркі [illegible] на больш высокай тэхнічнай базе ва ўмовах клясавае барацьбы ўнутры краіны і капіталістычнага акружэньня СССР выгнае ад пралетарыяту і ўсёй працоўнай грамадзкасьці ўпартае працы ў гранозе цяжкасьцяў, якія сустракаюцца на шляху сацыялістычнага буйніцтва. Пастановы партыйных зьездаў, пленумаў ЦК і ХУІ партканфэрэнцыі аб індустрыялізацыі краіны і капітальных укладаньнях у прамысловасьць з мэтаю дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны—патрабуе напружанай працы кожнага працоўнага ў ўсіх галінах гаспадаркі. Пралетарыят зразумеў паставленыя перад ім гістыяй задачы і зьяўляецца першым заваўніком ажыцьцяўленьня вялікіх задач сацыялістычнае перабудовы нашае краіны.

Шпаркі рост нашае прамысловасьці актывізуе пралетарыяту ў перадовае і умацаваньні нашае краіны клікае таленства з боку буржуазеі, ал розными шляхамі імкнецца перашкодзіць сацыялістычнаму будаўніцтву. На ўсе перашкоды з боку буржуазеі пралетарыят СССР, пад кіраўніцтвам ВКП(б) зварочвае яшчэ большую увагу на больш пасьпяховае правяньне і забясьпечаньне ажыцьцяўленьня 5-цігадовага пляну сацыялістычнай рэканструкцыі. Па прапанове ЦК партыйных, саюзных і савецкіх арганізацый з мэсц ЦК УсеКП(б) пастанавіў зрабіць 6 жніўня днём індустрыялізацыі, які павінен зьвяціца аглядам дасягненьняў пралетарыяту ў барацьбе за павялічэньне працоўнае дысцыпліны, за лепшую якасьць прадукцыі, за індустрыялізацыі і накапленьне і г. д.

Нашы школьныя справы.

„Дайце нам школу", так просіць, трабуе насельніцтва латыскай калоніі ў Глускім раёне, Бабруйскай акругі, але ніхто на гэта не зьвяртае ніякай увагі—ні РВК ні АВК, хаця сьвет іх закідаў сваімі хадайніцтвамі і „нізкімі паклонамі". Але што яскаму РВК—ні горача, ні холадна, латышы народ перпяліўы: год мучаліся дзеці ў розных „трушчобах", пачуцца яшчэ гадкоў са два-тры... і іншы раз і цярпенью бывае канец.

Будынак школы ў нас быў добры, трэба было зрабіць невялікі рамонт з дабудовай трохсьценьніка пад інтэрнат, на што пашло-б ня болей як 0-700 руб.

Але пажадалася старшыні нашага сельсавету Аболіну перанесьці будынак школы ў „цэнтр". Але ўсё роўна яна ня ў цэнтры, бо хутары знаходзяцца ў 5—7 клм. ад школы.

Аболін, як „спэц" прыступіў да перабудовы: пашырыў будынак амаль зал (бо інтэрнат усё роўна патрэбен) і лічачыся з сродкамі, якіх ад самаабкладаньня было каля 1000 руб. Увесь час працы РВК вадзіў за нос, а РВК ні разу не пацікавіўся ходам работ і плянам будынку. Толькі калі не хапіла ў Аболіна сродкаў і калі ён зьвярнуўся да РВК, апошні апомніўся, але было позна.

Такім чынам у пабудову ўложана ўжо калі 4000 руб., а праца выканана напалову, бо каб скончыць яе, патрэбна яшчэ каля 3 з пал. тысяч руб. У той-жа час, калі тут было-б зоркае вока гаспадара раёну—РВК, школа засталася-б на старым месцы, зроблен быў бы рамонт і інтэрнат і якіх небудзь 5-6 тысяч ня былі-б выкінуты на вецер.

Цяпер-жа наступае восень, трэба пачынаць заняткі, але няма дзе.

Памойму, трэба вінаватага прыцягнуць да адказнасьці.

Трэба ў гэту справу ўнікнуць РСІ, не абмяжоўваюцца бумажнай адпіскай, як гэта ў нас водзіцца, а вызначыць камісію, дасьледаваць і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Свой.

Выклікаем.

Адным з асноўных мэтадаў працы неходных для выкананьня пяцігадовага яну разьвіцьця народнай гаспадаркі, ванятага XVI усесаюзнай партканфэрэнцыяй і 5 зьездам саветаў—разьвіцьце ыялістычнага спаборніцтва, у якім моць і павінны браць удзел шматмільённыя прапоўныя масы Савецкага Саюзу. Прафэсійныя саюзы, якія аб'яднаюць ядомыя арганізаваныя масы працоўных павінны стаць на чале масавага руху—сацыялістычнага спаборніцтва, якое павінна таксама прайсьці міма шырокіх кадраў асьветнікаў. Канфэрэнцыя асьветнікаў Дубровенскага раёну, Аршанскай акругі, разумеючы вялікія задачы, ія ўскладаюцца на іх рабочай клясай, муністычнай партыяй і сав. уладай у праве выкананьня 5 гадовага пляну паставіла дабіцца выкананьня наступных ерапрыёмств, на пранягу 1929-30 навуч. ду накіраваных да ажыцьцяўленьня дач сацыялістычнага будаўніцтва; апраўваць надзею рабочай клясы і партыі, даўшы ўсё сваё ўменьне і сілы на інструялізацыю нашай краіны, на рэканструкцыю с-гаспадаркі, на ўздым культурнага ўзроўню працоўных:

Поўнае ўцягненьне ў школы з пачатку 929-30 нав. г. дзяцей школьнага ўзросту рабочых, батракоў і вясковай беднаты.

Дабіцца 100 проц. зьліквідаваньня вучускіх прагулаў і спазьненьняў.

Зьнішчыць другагодніцтва ў школах а акадэмічнай адсталасьці.

Дабіцца поўнага выкананьня вучэбных праграм, не паслабляючы якасьці.

Дабіцца ўцягненьня вучняў у грамадзка-карысную працу; уцягнуць іх у распаўсюджваньне газэт і папулярнай літаратуры.

Ніводнага дню прагулу на няяўцы настаўнікаў на заняткі бяз уважлівых прычын.

Поўны перавод школ на рэйкі цьвёрдага плянаваньня працы.

60 проц. асьветнікаў прымаюць удзел дарэмна ў ліквідацыі няпісьменнасьці дарослага насельніцтва ад 12 да 40 год. зьліквідаваўшы няпісьменнасьць 1500 асоб па райёну.

Практычна праз вучняў прыняць удзел у падпіцьці ўраджайнасьці.

Плянава раз у тыдзень праводзіць па школах чытку газэт.

Адчыніць яшчэ 10 чырвоных куткоў і 10 с.-гасп. гурткоў.

Пашырыць антырэлігійнае і інтэрнацыянальнае выхаваньне сярод насельніцтва і арганізаваць 5 ячэек бязбожнікаў.

Дабіцца зачыненьня на райёне 3 цэркваў і 2 сынагог.

На райёне прэміраваць лепшую школу радыёўстаноўкай.

Утварыць міжрайённы прэміровачны фонд у 600 р. (па 300 ад райёну).

На спаборніцтва выклікаць асьветнікаў КОПЫСКАГА райёну, Аршанск. акр.

М. С-н.

ВЫКОНВАЕМ ЗАВЕТ ІЛЬЛІЧА.

Ворагі пралетарскае рэвалюцыі ня раз прарочылі, што дыктатура пралетарыяту нядоўга праісную з прычыны некультурнасьці, якую пакінулі царскія сатрапы і зграя капіталістаў сярод пралетарыяту і працоўнага насельніцтва. Капіталісты нават і ня раілі рабочым браць уладу ў свае рукі з прычыны тае-ж самае некультурнасьці.

Уладзімір Ільліч глядзеў на пралетарскую рэвалюцыю як на фактар, які больш хутка зьнішчыць некультурнасьць сярод працоўных і ў першую чаргу сярод пралетарыяту, калі даць, як ён сказаў, такую прадпасылку: прагнаць памешчыкаў і капіталістаў. Гэта зроблена. Пралетарыят пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі будуе сацыялістычную краіну. Усё новыя і новыя махі-гіганты растуць у краіне, патрабуючы спэцыялізаваных рабочых і тэхнічна адукаваных рабочых. Сельская гаспадарка з пераходам на сацыялістычныя рэйкі патрабуе адукаванага гаспадара, больш адукаванага, чым гэта мы маем зараз. Пралетарыят ніколі ня мірыўся з некультурнасьцю ў яго шэрагах, якая яшчэ значна шкодзіць будаваць сацыялістычную краіну.

Уладзімір Ільліч вучыў рашуча змагацца і на фронце ліквідацыі няпісьменнасьці, кажучы: «Мы павінны ўзяцца за простую і неабходную справу ліквідацыі пісьменных для барацьбы з няпісьменнасьцю. Кожны пісьменны назавек павінен глядзець, як на свой абавязак, на неабходнасьць навучыць некалькі няпісьменных». Гэты завет мы яшчэ ня выканалі. Адказнасьць якая падае на грамаду за яго выкананьне, вялікая, а тым больш яна вялікая перад культурна-асьветніцкімі масамі.

Ці выкарысталі мы ўсе магчымасьці ў гэтай справе? Гэтых магчымасьцяў мы ня выкарысталі. Нават тое, што дае дзяржава, скарыстоўваецца не папризначэньню, а ў некаторых мясцох зусім не скарыстоўваецца. На сёнешні дзень у нас знаходзяцца людзі, якія лічаць непатрэбнай ліквідацыю няпісьменнасьці. Яны хочуць чакаць вучонага маладога пакаленьня, а пра сучаснага будаўніка яны зусім забыліся.

У справе ліквідацыі няпісьменнасьці ў нас яшчэ шмат руціны, нядбайнасьці.

Справу ліквідацыі няпісьменнасьці можна значна палепшыць. Прыкладам гэтаму можа быць мінулы год, калі ўдзел грамадзкасьці даў магчымасьць ахапіць на сто процантаў пэрспэктыўны плян, ня гледзячы на тое, што сродкаў было адпушчана на 46,6 проц. пляну. У параўнаньні з 1927-28 навучальным годам сродкі павялічыліся на 16,9 проц., а навучалася няпісьменных у два з паловай разы больш; і выпуск з лікпунктаў таксама надвоіўся. Якасьць навучаньня палепшылася. Асабліва ў гэтым годзе разгарнулася індывідуальнае навучаньне, як форма грамадзкай дзейнасьці ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці. Калектывы настаўніцтва некаторых сямігадовых працоўных школ праводзілі вялікаю працу на лікпунктах. прыцягваючы да работы агранома, ўрача; яны ўтваралі сапраўды штаб поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці. Гэты вопыт трэба запазычыць усім сямігодкам, і ўжыць у бягучым г.

Як недахоп і шкодны недахоп у працы трэба лічыць тое, што палітасьветустановы не скарыстоўваюць лікпункты для правядзеньня масавае палітыка-асьветнае работы. Яны не змаглі выкарыстаць вольны час слухачоў лікпунктаў. Тут трэба запазычыць практыку прадпрыёмства, якое выкарыстоўвае наўгадзіны нерапынку для масавае культурна-асьветнае работы.

Ці можна сказаць на сёнешні дзень, што нашы прафсаюзы прымалі ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці належны ўдзел? Не. Да 1 красавіка 1927 г. па прафсаюзах налічвалася да 15 тысяч няпісьменных (6,7 проц.) і навучыць іх на лікпунктах каштуе каля 90 тыс. рублёў. Прафсаюзы ў працягу двух год павінны былі-б зьліквідаваць няпісьменнасьць, але гэтага яшчэ няма. Культаддзелы прафсаюзаў складалі вялізныя пляны з тлумачальнымі запіскамі, вынікаў пакуль няма і будуць яны вельмі мізэрнымі, аб чым сьведчаць лічбы ЦСУ, што прафсаюзы ахапілі 1,7 проц. замест 10 проц. па пэрспэктыўнаму пляну.

Прафсаюзы на 1929-30 год павінны паставіць задачу поўнага ахопу няпісьменных па саюзах і ліквідацыі няпісьменнасьці. І сілы і сродкі яны маюць дастатковыя для гэтага. Пры выкананьні гэтае задачы трэба толькі зьліквідаваць непасрэднае кіраўніцтва і арганізацыйнай і мэтадычнай працай, аб'яднаць і сродкі і сілы ў адзіным цэнтры і скасаваць інструктарскія пасады па паасобных прафсаюз

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб выніках праверкі сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчых правоў, і заяў аб аднаўленьні у выбарчых правах.

Заслухаўшы даклад Цэнтральнай Выбарчай Камісіі аб праверцы правільнасьці складаньня сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчых правоў, і заяў аб аднаўленьні ў выбарчых правах, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР адзначае:

1. Сьпісы асоб, пазбаўленых выбарчых правоў у вогуле былі складзены больш правільна, чым у мінулую кампанію, пры чым маецца павялічэньне процанту пазбаўленых выбарчага права ў параўнаньні з мінулай кампаніяй, за лік лепшага выяўленьня капіталістычных элемэнтаў у горадзе і на вёсцы па ўсіх катэгорыях саветаў: па сельсаветах пазбаўлена 1,8 проц. замест 1,4 проц. у 1927 г., па местачковых саветах—14,8 проц. замест 14,0 проц. у 1927 г.; па неакруговых гарсаветах—13,9 проц. замест 12,8 проц. у 1927 г. і па акруговых гарсаветах—9,1 проц. замест 8,0 проц. у 1927 г.

2. Ня гледзячы на павялічэньне ў 1929 годзе колькасьці асоб, пазбаўленых выбарчых правоў, усё-ж ня выяўлены усе тыя элементы, якія павінны быць пазбаўлены выбарчых правоў. Разам з гэтым у паасобных раёнах дапушчаны былі памылкі ў бок пазбаўленьня выбарчых правоў працоўных (працоўнае яўрэйскае насельніцтва, якое ў мінулым часе мела магчымасьці займацца вытворчай працай і г. д.). Гэтыя паасобныя памылкі сваечасова ня былі выпраўлены.

3. Выкананьне дырэктывы Прэзыдыуму ЦВК БССР аб праверцы правільнасьці складаньня сьпісаў асоб пазбаўленых выбарчых правоў і разгляду заяў аб аднаўленьні ў выбарчых правах паасобнымі раённымі і акруговымі выбарчымі камісіямі, праводзілася фармальна, чым праверка была зьведзена да звычайнай перапіскі дырэктыў і адсылкі іх ніжэйшым органам. У паасобку, адзначаецца недастатковае выкананьне дырэктывы аб праверцы па гарадох.

Выходзячы з адзначанага, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць выканаўчым камітэтам і саветам справу пазбаўленьня і аднаўленьня ў выбарчых правах паставіць як сыстэматычную галіну работы саветаў, пільна сачыць у штодзённай працы за поўным выяўленьням тых асоб, якія павінны быць пазбаўлены выбарчых правоў, а таксама вабяськечыць аднаўленьне ў выбарчых правах працоўных, няправільна пазбаўленых гэткіх. З асаблівай увагай у гэтых адносінах падыходзіць да бядняцкага яўрэйскага насельніцтва, якое становіцца на шлях грамадзка-карыстнай працы.

2. Цэнтральнай Выбарчай Камісіі з удзелам прадстаўнікоў НКЮ, НК РСІ, НКФ і іншых зацікаўленых савецкіх органаў і грамадзкіх арганізацый, распрацаваць праэкты тлумачэньняў і неабходных зьмен у існуючую інструкцыю аб выбарах у саветы, каб папярэдзіць у далейшым дапушчэньне памылак як у сэнсе няправільнага пазбаўленьня, так і непазбаўленьня выбарчых правоў. У прыватнасьці, зрабіць ясныя тлумачэньні ў дачыненьні катэгорый асоб, пражываючых на непрацоўныя прыбыткі, утрымаўцаў ісялян ужываючых у гаспадарцы часовую наёмную рабочую сілу.

3. Цэнтральнай Выбарчай Камісіі з прыцягненьне прадстаўнікоў НК РСІ перапрацаваць формы вучоту асоб, пазбаўленых выбарчага права ў такім напрамку, каб яны давалі пэўны адбітак, як пры чым пазбаўленьня выбарчых правоў, гэтак і сучаснага сацыяльна-маёмаснага становішча пазбаўляемых, каб зрабіць больш рэальнай магчымасьць праверкі правільнасьці складаньня сьпісаў асоб, пазбаўленых выбарчага права.

Час. вык. абав. Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Хацкевіч.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **У. Ігнатоўскі.**

20 ліпеня 1929 г.
г. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра парадак падачы дапамогі і пэнсіі па сацыяльным страхаваньні, якія ня былі поўнасьцю атрыманы застрахаванымі з прычыны іх сьмерці.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Дапамогі і пэнсіі па сацыяльным страхаваньні, якія не атрыманы ад страхавых органаў да моманту сьмерці застрахаваных, могуць атрымаць наступныя члены сям'і памерлага застрахаванага:

а) непаўналетнія дзеці, усынаўлёныя, браты і сёстры да 16 гадоў;

б) непрацаздольныя дзеці, усынаўлёныя, браты і сёстры незалежна ад веку, якія знаходзіліся на ўтрыманьні памерлага;

в) бацькі, усынавіцелі і муж (жонка) незалежна ад іх працаздольнасьці.

2. Правы на атрыманьне паказаных дапамог і пэнсій вызначаюцца пастановаю адпаведнай акруговай страхавой касы пасьля паданьня пасьведчаньняў аб тым, што асоба, якая падняла хадайніцтва, зьяўляецца членам сям'і памерлага ў адпаведнасьці з арт. 1 гэтае пастановы. Паказаныя дапамогі і пэнсіі разьмяркоўваюцца страхавою касаю раўнамерна паміж членамі сям'і, якія маюць права на іх атрыманьне і выдаюцца паводле правіл, устаноўленых для выдачы дапамог членамі сям'і, што страцілі кармільца.

3. Хадайніцтва аб выдачы паказаных у арт. 1 гэтае пастановы дапамог і пэнсій павінны падавацца на працягу шасьці месяцаў ад дня сьмерці застрахаванага.

4. Скаргі на дзеяньні акруговых страхавых кас па пытаньнях выдачы паказаных у арт. 1 гэтае пастановы дапамог і пэнсій могуць падавацца ў Галоўнае Кіраўніцтва Сацыяльнага Страхаваньня Народнага Камісарыяту Працы БССР.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Калевіч.**

25 ліпеня 1929 г.
г. Менск.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

пра праверку электрычных лічнікаў і вымеральных трансфарматараў.

У сувязі з выданьнем ВСНГ СССР загаду № 437 ад 18 лютага гэтага году аб абавязковай праверцы электрычных лічнікаў і вымеральных трансфарматараў на падставе артыкулу 6 Палажэньня аб мерах і вагах, зацьверджанага ЦВК і СНК СССР 6-VI-1924 году (Вестнік ЦВК, СНК і СПА СССР 1924 г. № 6, арт. 202) эканамічная нарада пастанаўляе:

1) Пастановы сваю ад 4 чэрвеня 1926 году пра праверку электрычных лічнікаў—скасаваць;

2) Прапанаваць ВСНГ і Беларускай Палаце Мер і Вагі ў адносіне паверкі электрычных лічнікаў і вымеральных трансфарматараў кіравацца памянёным загадам па ВСНГ СССР № 437 і апублікаваць да агульнага ведама парадак паверкі і разьмер устаноўленых за яе збораў.

Старшыня Эканамічнае Нарады пры СНК БССР **М. Карклін.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **В. Крывіцкі.**

27 ліпеня 1929 г.
г. Менск.

Пастанова

Эканамічнае Нарады пры СНК БССР

пра дапаўненьне § 7 пастановы Эканамічнае Нарады за 15 сакавіка 1928 году пра парадак выдачы прыватным асобам дазволу на адчыненьне, пераабсталяваньне і капітальны рамонт прамысловых прадпрыёмстваў.

Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе дапоўніць пастанову сваю пра парадак выдачы прыватным асобам дазволу на адчыненьне, пераабсталяваньне і капітальны рамонт прамысловых прадпрыёмстваў (З.З. БССР 1928 г., № 16, арт. 149) параграфам 7 наступнага зьместу:

„7. Прыватныя асобы, якія адчынілі, пераабсталявалі або адрамантавалі свае прадпрыёмствы без папярэдняга дазволу адпаведных выканаўчых камітэтаў (п. п. і і 2), падлягаюць адказнасьці ў адміністрацыйным парадку—штрафу да 500 руб., а іх прадпрыёмствы могуць быць зачынены інспэкцыяй мясцовай прамысловасьці".

Старшыня Эканамічнае Нарады пры СНК БССР **М. Карклін**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **В. Крывіцкі.**

30 ліпеня 1929 г
г. Менск.

НА БУДАЎНІЦТВЕ СТАНЦЫІ ІМЯ Тав. СТАЛІНА.

Будаўніцтва на Асінбудзе праходзіць здавальняюча.

Інспэкцыя ВСНГ Бел. супольна з прадстаўнікамі РСІ і Галоўэлектра правялі абсьледаваньне будаўніцтва на Асінстроі. Абсьледаваньне ахапіла ўвесь ход будаўніцтва, падрыхтоўку спажыўцоў электраэнэргіі і разьвіцьцё тарфяной гаспадаркі.

Заканчваецца пабудова галоўнага корпусу электрастанцыі, які будзе гатоў у верасьні, вядзецца па жыльлёвае будаўніцтва ў пас. Арахі,—заканчываюцца работы ў Выдрыцы. Узмоцненым тэмпам ідзе ўстуноўка ліній перадачы электраэнэргіі. Разгарнулася падрыхтоўка да пабудовы паніжаючых падстанцый у Віцебску, Воршы і Дуброўне.

Заказы на абсталяваньне савецкай вытворчасьці для электрастанцыі ўжо здадзены; у бліжэйшым часе будуць разьмеркаваны заказы на належнае абсталяваньне.

У працэсе пабудовы галоўнага корпусу электраэнэргіі была праведзена перапрактыроўка дзеля спрашчэньня канструкцый і зьніжэньня кошту будаўніцтва. Шырока праводзіцца мэханізацыя работ: устаноўлены бэтонамяшалкі, пад'ёмнікі, прыстасаваньні для рэзкі і гнуцьця арматуры і інш. Недахопу ў асноўных будаўнічых матар'ялах не адчуваецца.

На торфараспрацоўках у Шабанах пабудаваны 4 пасёлкі; пры пабудове іх прадугледжаны максымальныя патрэбы рабочых у быце і культпрацы.

Да недахопаў будаўніцтва трэба аднесьці тое, што „Энэргастрой" вельмі слабым тэмпам выконвае рабочыя чарцяжы на галоўных і дапаможных пабудовах, а гэта адбіваецца на тэмпе будаўніцтва. Назіраецца таксама затрымка ў афармленьні ліцэнзій і разьмеркаваньні заказаў па імпартнае абсталяваньне. Будаўніцтва адчувае некаторыя цяжкасьці і ў нармальным фінансаваньні. У выніку гэтага ёсьць пагроза, што будаўніцтва ў вызначаны Савнаркомам тэрмін (1-III—1930 г.) ня будзе скончана.

У сэнсе падрыхтоўкі спажыўцоў электраэнэргіі Асінбуду ўжо складзены амаль усе правілы, якія будуць зацьверджаны да кастрычніка. Амаль усе спажыўцы далі заказы ці заяўкі на электраабсталяваньне, але пляма яшчэ канчатковага каляндарнага пляну мантажных работ. Слаба праводзіцца работа па сельскай электрыфікацыі.

Торфараспрацоўкі вядуцца па плану. Як мы зазначылі, рабочыя добра забясьпечаны жыльлём і ўсім неабходным у культурна-бытавых адносінах.

Сёлета будзе выпрацавана звыш 30.000 тон торфу—амаль будзе выканана праграма.

ХРОНІКА.

Папярэдняя падпіска на трэцюю пазыку.

У Воршы пачалася папярэдняя падпіска на трэцюю пазыку індустрыялізацыі. Колектывы супрацоўнікаў Акрфінаддзелу, Дзяржбанку, Дзяржтораху, Сельбанку, Акрвыканкому, Дняпросаюзу і ЦРК пастанавілі падпісацца на новую пазыку ня менш як на паўтарамесячны аклад пэнсіі кожны. Некаторыя падпісваюцца і на трохмесячны аклад. Усюды пазыка праходзіць пад лёзунгам:—„Пагалоўнай падпіскай на новую пазыку дапаможам уладзе хутчэй павесьці індустрыялізацыю краіны і ўзмацніць абароназдольсьць, каб даць належны адпор сусьветнаму капіталізму.

Кампанія папярэдняй падпіскі з кожным днём пашыраецца. Яна ўжо перакінулася і на вёску.

Мала зварочваюць ўвагі на вылучэнства.

Прэзыдыум ЦП саюзу гарбароў абгаварыў даклад Скуроындыната аб арабочваньні загатоўчага апарату апошняга.

Прэзыдыум адзначыў, што арабочваньне загатоўчага апарату праходзіць недастаткова, вылучэньне рабочых праводзіцца, галоўным чынам, за рахунак пашырэньне апарату, а не замена негодных працаўнікоў. Пастаноўлена праз месяц пры ЦП саюзу склікаць нараду вылучэнцаў.

Новы дапаможнік па антырэлігійнаму выхаваньню.

Цэнтральная Дасьледчая Школа склала дапаможнік па антырэлігійнаму выхаваньню ў школе-сямігодцы. Навукова-Мэтадалёгічны Камітэт НКА дапусьціў гэту кніжку ў якасьці дапаможніка для настаўнікаў II канцэнтру сямігодак. Кніжка здадзена ў друк.

Узмацнілася паступленьне заяў у ВНУ.

Паводле апошніх вестак на ўсе факультэты БДУ паступіла 542 заявы, у Менскі Політэхнікум 840 заяў, з іх 272 ад рабочых і 259—ад сялян.

У Віцебскі політэхнікум пададзена 246 заяў, з іх ад рабочых і іх дзяцей—98.

Апрабацыя гатунковага збожжа.

Усе чатыры кантрольныя насенныя станцыі БССР (Менская Горацкая, Гомельская і Віцебская), а таксама і Полацкае кантрольна-насеннае бюро распачалі працу па апрабацыі збожжа сёлетняга ўраджаю.

Племянная жывёла для БССР.

Управе дзяржгандлю перададзены заказы на закупку племяннае жывёлы і птушак для НКЗ. Птушкі і жывёла будуць закуплены ў Нямеччыне, Данії, Швэцыі, і Англіі.

2728 цэнтнэраў гатунковага жыта для БССР.

У хуткім часе будзе дастаўлена з дзяржаўнага насеннага фонду РСФСР 2728 цэнтнэраў гатунковага жыта на насеньне, якое будзе разьмяркована па акругах БССР.

Кантрольна-імпартны санітарны зоопункт.

НКЗ мяркуе пабудаваць у Полацку кантрольна-імпартны санітарны зоопункт; на пабудову яго ўжо адпушчана 100.000 рублёў.

Тыповыя 300 лячэбніцы

Пачынаючы з наступнага году ў кожнай акрузе будуць пабудаваны 2 тыповыя зоолячэбніцы. Кошт кожнае—18.000 руб.

Ліквідацыя няпісьменнасьці сярод гарбароў.

Прэзыдыум ЦП саюзу гарбароў на апошнім пасяджэньні пастанавіў у наступным годзе поўнасьцю ліквідаваць непісьменнасьць сярод членаў саюзу, а малапісьменнасьць—сярод 1000 чал.

Будзе адчынена шэраг лікпунктаў пры ўсіх больш буйных прадпрыёмствах скурапрамысловасьці БССР. Для рабочых дробных прадпрыёмстваў будуць арганізаваны раённыя лікпункты і школы малапісьменных. Будзе таксама арганізавана шэраг груп для навучаньня дома.

Водпуск тав. А. Хацкевічу.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР тав. А. І. Хацкевіч з 1 жніўня выехаў у дазволены яму Прэзыдыумам ЦВК 1½ месячны водпуск.

На час водпуску тав. Хацкевіча час. вык. абавязкаў сэкратара ЦВК БССР даручана тав. Сташэўскаму.

Да зьлёту ТДА-авіахімаўцаў.

23-га жніўня Менскі Акруговы Савет арганізоўвае зьлёт ТДА-авіахімаўцаў, які працягнецца тры дні. Галоўная ўвага зьлёту будзе аддадзена стралковаму спаборніцтву. На зьлёт прыбывае 18 камандз. Усяго будзе ўдзельнічаць 180 чал., па 10 ч. з райёну, рэшта—з гарадзкіх арганізацый.

Камандная стральба будзе адбывацца ў ціры на Пярэсьпе з дробна-каліберных вінтовак.

Пасьля агульнага спаборніцтва адбудуцца індывідуальныя, дзе прымуць удзел самыя лепшыя стралкі.

Лепшым стралкам будзе выдадзена 10-12 прызоў на суму 216 руб.

Райённыя арганізацыі павінны зараз-жа павесьці падрыхтоўчую працу, каб як найлепш выкарыстаць зьлёт.

В.

Навіны кіно.

Перадача кіно гарадоў Белдзяржкіно.

Белдзяржкіно прыняло пад сваё кіраўніцтва кіно-тэатры ў Бабруйску, Магілеве і Гомелі. Усяго прынята 6 кіно-тэатраў, якія будуць адрамантаваны і да абсталяваны.

Кіно-фільм „Гомельшчына".

Па заказу Гомельскага акрвыканкому Белдзяржкіно робіць здымкі кіно-фільму „Гомельшчына".

Гэты фільм адаб'е гісторыю і разьвіцьцё Гомельскай акругі.

Апавяшчэньне.

САД АСЬВЕТЫ.

Сягоньня кіно „Бухта Сьмерці". Пачатак роўна а 10 гадз.

Вэтэрынарная справа ў Б

Буйны рост нашай сельскай гаспадаркі і значэньне далейшага аднаўленьня і разьвіцьця жывёлаводнай галіны, як з пункту погляду рацыяналізацыі с-гаспадаркі, так і павялічэньня яе таварнасьці, ставяць перад намі на чаргу задачу пагашэньня мерапрыёмстваў, у галіне вэтэрынарнае справы. Ужо ў сучасны момант мы маем у цэлым шэрагу райёнаў у некаторых галінах жывёлагадоўлі колькасны рост, які перавышае даваенныя разьмеры. [illegible] году, напэўна, дасьць новы штуршок далейшаму росту жывёлагадоўлі на ўсёй рэспубліцы. Адсюль і вэтэрынарная справа, якая стаіць на варце аховы жывёлагадоўлі, павінна заняць не апошнае месца ў с-гаспадарцы.

Гэта значэньне вэтэрынарыі ацэнена ўладаю, аб чым гаворыць нам тыя сродкі, якія адпушчаюцца ёю на разьвіцьцё вэтэрынарнае справы ў БССР.

У 1928-29 годзе на вэтэрынарную справу БССР было адпушчана па дзярж. бюджэту 241.444 р. і з мясцовых сродкаў—632.844 р., на 1929-30 год намечана да водпуску—па дзярж. бюджэту 847.585 р. і з мясцовых сродкаў—905.575 руб.

Каб азнаёміцца з разьвіцьцём вэтэрынарнай справы ў БССР, даволі прывесьці даныя аб аказаньні вэтэрынарнай дапамогі хворай жывёле за апошнія гады. У 1926-27 годзе вэтдапамога была аказана 637.341 гал. сялянскай жывёлы (коням і раг. скаціне), а ў 1927-28 г. лекавая дапамога была аказана ўжо 792.020 гал.—павялічэньне на 24,3 процанта.

У 1926-27 г. нашы вэтэрынарныя ўстановы ахоплівалі сваёй дапамогай толькі 17,3 проц. патрэбы. Гэты разрахунак зроблен на падставе тых дапушчэньняў, што 50 проц. налічнага ліку жывёлы патрабавала вэтдапамогі.

У 1927-28 г. вэтдапамогай было ахоплена ўжо 23 проц. патрэбы. Гэты процант на перцы погляд можа паказацца нязначным, але калі прыняць пад увагу, што сетку вэтэрынарных вучасткаў у БССР нельга лічыць шырока разьвітай, то павялічэньне ахвату вэтдапамогай за адзін год на 6,3 проц. трэба прызнаць вельмі значнай.

У справе барацьбы з [illegible] робамі сярод жывёлы [illegible] новы ў 1927-28 г. [illegible] чымся ў 1926-27 г. [illegible] западзіны нагадваюць [illegible] красухи і сэнтыцыны [illegible] ваўка на 6 раг. жывёлы [illegible] сібірская язва сярод усіх [illegible] 6. раг. жывёлы і шалёс[illegible] відаў жывёлы.

[illegible] мерамі ў барацьбе [illegible] отымі зьяўляюцца [illegible] шчэпкі, разьвіцьцё [illegible] і вэтасьветная работа [illegible]

Непасрэднымі [illegible] пошасным хваробам [illegible] вага роду прышчэпкі. [illegible] чыць той факт, што [illegible] вельмі ахвотна робіць [illegible] ціне, дзякуючы чаму [illegible] за апошні год (27-28) [illegible] Так, у 1926-27 г. было [illegible] прышчэпак, а ў 1927-28 г. [illegible]

За апошні год значна [illegible] сама наш Вэтэрынарны [illegible] інстытут, які выробле[illegible] прышчэпкі, прычым [illegible] 1927-28 г. было выробле[illegible] раў, тады як ў 1926-27 г. [illegible] Але гэтай колькасьці [illegible] яецца далека недастатко[illegible] ных патрэб нашага жы[illegible] напрыклад, прышчэпкам [illegible] сьвінеі мы можам [illegible] 10 проц. усіх нужданчых [illegible] супроць Красухі—да 40 [illegible] бірцы—да 80 проц. будзе [illegible] патрабуе такіх прышчэп[illegible]

Нарэшце, сетка [illegible] каў у БССР у 1927-28 [illegible] на 11 і замест 115 [illegible] мы маем цяперака 126 [illegible] чэбніц існуе 45 і амбулаторый [illegible]

Вэтурачоў і фельчароў [illegible] было 254 чал., а ў 1927-28 [illegible] Плошча вэтурачэбнага [illegible] ў сярэднім 1016,8 кв. кіл. [illegible] 17,9 кіл., прычым на [illegible] прыходзіцца ў сярэднім [illegible] жывёлы, тады як за [illegible] частка прынята лічыць [illegible] 5.000 адзінак жывёлы.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ".

„ТАНКРЭД І КЛЁРЫНДА",

Гэты замежны фільм лішні раз пацьвярджае неабходнасьць быць асьцярожным пры імпарце замежнае кіно-прадукцыі.

Трэба думаць, што перад тым, як фільм трапіў на савецкі экран, над ім быў зроблен экспэрымэнт перамантажу, алнак, няўдалы. „Белыя ніткі" так і пруць з яго.

„Танкрэд і Клёрында"—фільм з эпохі паходаў крыжакоў на „няверных". Можна і трэба, калі браць гістарычную тэму для фільму, ускрыць сацыяльна-эканамічную сутнасьць падзей. Такі фільм быў-бы для нас зусім прыемлемы. Але можна зрабіць і інакш: на фоне гістарычных падзей разгарнуць звычайную любоўную гісторыю, разам з тым служачы іншым мэтам: узьняцьцем духу „верных" для... новых крыжавых паходаў. Такі фільм для нас зусім ня прыемлемы і шкодны. Гэты фільм якраз такі. На фоне экзотыкі апрацоўваецца ідэалёгія дробнага буржуа капіталістычных краін.

Што іншае можна азначыць, прыкладам, такі гэст: Танкрэд, адзінаборстве сарацынскім лус з мальбою да неба [illegible] мы ведаем, што рукатка [illegible] ўдавала „крыж? Або як [illegible] надпіс: „Клерында (сярэд[illegible] дзяўчына „небесной красоты [illegible] гла мне принадлежать при[illegible] пусть смерть нас соединит" [illegible] сьвепе, у „загробной жизни"

Крыжакі не магалі [illegible] паходамі супроць „неверных" [illegible] паходамі супроць „Сьвятой зямлі" [illegible] сэнс і значэньне перамогі [illegible] ня той, што буржуазі [illegible] крыжакоў нашага часу?

Такі шкодны ідэалёгічны [illegible] Значна вышэй мастацкае [illegible] батальных сцэн, так і [illegible] гі. Уласна кажучы, тут [illegible] любоўных інтрыг, перапле[illegible] разьвязкаю.

Нарэшце, трэба адзначыць [illegible] артыстаў і дасканалую рэжы[illegible] Але гэта не апраўдвае [illegible] му на нашым экране.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 2-га ЖНІЎНЯ 1929

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.84	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	127.75	129.75
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.75	101.15
10 проц. выйгр. пазыка 1927 г.	26.16	26.26
3-я сялянск. выйгр. паз. 1927 г.	5.00	—

Дзярж. паз. узм. сял. гас. [illegible]
1 выйг. паз. індустр. 27 г. [illegible]
2 „ „ „ проц. [illegible]
„ „ „ 6-проц. [illegible]
II проц. дзярж. паз. 28 г. [illegible]
12 проц. рэнтная пазыка 1927 г. [illegible]

Часова выкон. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТ[illegible]

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

Віцебскай Дзяржаўнай махорачнай фабрыкі

АКТЫЎ на 1-е кастрычніка 1928 году. ПАС[illegible]

I. Маёмасьць.			**I. Капіталы**		
1. Будынкі і пабудовы	371223—82		1. Статутны		676705—60
2. Абсталяв., машыны і інстр.	138260—02		2. Амартызацыйны		72498—38
3. Гаспадарчы інвэнтар	8879—01		3. Рэзэрвовы		11377—58
4. Транспарт	2398—50	520761—35	4. Капітал пашырэн. прадпр.		3955—22
II. Запаснае абсталяв.		3161—49	**II. Фонды.**		
III. Матар'ялы.			1. Фонд паленш. быту рабоч.		
1. Сыравіна	125996—26		**III. Рэзэрвы.**		
2. Апал	2187—11		1. Рэзэрв нянэўных даўгоў		10896—59
3. Дапаможныя матар'ялы	84622—31		2. „ надыходзяч. выдатак		5045—17
4. Рамонтна-будаўн. матар'ялы	8013—39		**IV. Доўгатэрм. крэдыты:**		
5. Матар'ялы ў дарозе	23830—59	244649—66	Ссуда з прамфонду		
IV. Няскончаныя загатоўкі		23—56	**V. Банкі:**		
V. Няскончаная вытворч.		19239—69	Банкі па вучоту вэксал.		
VI. Паўфабрыкаты		10675—93	**VI. Вэксалі выдадзеныя**		
VII. Тавары і гат. вырабы		51923—36	**VII. Крэдыторы:**		
VIII. Каса і бягуч. рахун.		15566—88	1. Рабочыя і служачыя		4565—63
IX. Каштоўныя паперы		11952—99	2. Дастаўшчыкі і падрадчыкі		4174—49
X. Паі і акцыі		70568—05	3. Неаплач. падаткі і зборы (акцыз).		404586—
XI. Уклады і ссуды		17205—31	4. Крэдыторы розныя		42537—30
XII. Вэксалі да атрыманьня.			Прыбытак за справаздачны год		
1. У партфэлі	208201—93				
2. На інкасо	8158—23				
3. У вучоце	246089—83	462449—99			
XIII. Падсправазд. сумы		1748—35			
XIV. Дэбіторы.					
1. Рабочыя і служачыя	6314—96				
2. Дастаўшчыкі і падрадч.	1009—46				
3. Пакупнікі і заказчыкі	185918—15				
4. Дэбіторы розныя	7698—21				
5. Няпэўныя даўгі	11022—82	211963—60			
XV. Выдаткі будуч. год		12978—82			
Баляне		1654869—03	БАЛЯНС		

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І СТРАТ

Страта ад рэалізацыі торфу	15558—26		Прыбытак ад рэалізацыі		
„ па выбыўш. маём.	1322—59		Процанты атрыманыя (сальдо)		
Адліч. у рэзэрв няпэўн. даўг.	10296—55		Розныя прыбыткі		
Гандлёв. выдаткі	44582—39				
Розн. страты і выдаткі	4769—52	76529—31			
Прыбытак (сальдо)		135267—39			
Баляне		211796—70	Баляне		

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ПРЫБЫТКАЎ.

На на прыбытковы падатак—10 проц.	
У „ВТУЗ"—3 проц. з рэшты	13526—74
„ „ФУБР"—10 проц.	3652—23
„ Рэзэрвовы фонд—10 проц.	11808—84
„ ОДК—10 проц.	11808—84
У прыбытак казны 40 проц.	11808—84
Капітал пашырэн. 25 проц.	47235—38
У фонд санірав. 4,75 проц.	29522—10
„ „ падахочв. 0,25 проц.	5609—19
	295—23
УСЯГО	135267.39

Кіраўнік фабрыкі ЦЁМКІН.

Галоўны бухгальтар ШУСТЭР.

Гэты баляне, рахунак прыбыткаў і страт і разьмеркаваньне прыбыткаў зацьверджаны ў пасяджэньні Прампляну ВСНГ БССР 1-II-29 г. (пратакол № 56) і дазваляецца да абвешчэньня ў друку.

Нам. Старшыні Прампляну ВСНГ БССР ПАГОСЦКІ.

Менск, Дзяржаўная друк[illegible]

ТЭАТР—КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ
Пятніца 2-га жніўня
„СИЛЬВА" у 3-х дзеях КАЛЬМАНА.
ПАЧАТАК А 9-Й ГАДЗІНЕ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА", 3 аўторка 30 ліпеня
БУЙНЫ МАСТАЦКІ БАЯВІК
„СПРАВА 128"
І кіно-хроніка савкіно № 34.
Пачатак а 8 гадз., каса а 6 гадз.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71.
3 аўторка, 30 ліпеня.
Новы мастацкі (— фільм (— **„ДЖАЛЬМА".**
кіно-драма ў 7 частках.
Штодня 2 сэансы пачатак: 1-га—9 г. 15 х. 2-га—10 г. 45 х.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».
Грандыёзны мастацкі замежны фільм
„ТАНКРЭД І КЛЕРЫНДА"
паэма ў 7 частках.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
„ДОНА ЖУАНА"
пачатак а 7 з палов. гадз., каса а 6 г.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
„КНІГА ПОШТАЙ"
Менск, Пляц Волі 5.
ВЫСЫЛАЕ ЛЮБУЮ КНІЖКУ накладной платай па атрыманьні задатку 25 проц.
Заказы да 1 р. выконваюцца па атрыманьні усяго кошту кніг.
Перасылка—пры высылцы наперад усяго кошту заказу ДАРМОВА.
ШКОЛАМ І ЎСТАНОВАМ СКІДКА 10%.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ УСТАНОЎ І АСОБ, што ў бюлетэні СНК БССР № 6 1929 г. абвешчана Пастанова Народнага Камісарыяту унутраных Спраў аб перарэгістрацыі таварыстваў і саюзаў, якія ня маюць на мэце атрыманьня прыбыткаў, з паказаньнем парадку і тэрмінаў перарэгістрацыі.

Зенькаўскі с-савет Вузьдзенскага раёну выклікае на 25 жніўня гр-н. **Якімовіч Пятра Сымонава і Якімовіч Зосю Казіміраву** па справе аб скасаваньні шлюбу.

Згублена пячатка Гарэліцкага сельсавету, Пухавіцкага раёну, Менскай акругі—лічыць несапраўднай.

Сэкратар с.-с. **Герман.**

ЗГУБЛЕНЫ.

Партбілет №1109335 Цітава П. А., выд. Аршанск. акружкомам, кв. 428 п.

Сяброўскі білет № 21052 Цітава П. А., выд. саюзам працямлі і лесу, кв. 428 п.

Пэнсіён. кніжка Амрасевай С. П. за № 1467, выд. Палтаўскай страхкасай, кв. 428 п.

Дапрызыўная кніжка № 405 Трыфанава Ц. К. выд. Гарэцкім РВК, кв. 428 п.

Закрэпіц. талён 2-й пазыкі індустр. № 24 сер. 031492, № 23 сер. 002553, 002551, 002550, 002552 на імя Лебедка С. Ф., вв. 428 п.

Сяброўскі білет № 29573 Самахвалава В. П., выд. працямлі і лесу, кв. 428 п.

Доўгатэрм. чырвонаармейскі кніжка № 2344 Дазарцэва А. І., выд. Горэцкім РВК, кв. 428 п.

Сяброўскі білет № 1664 Крывацэіна С. І., выд. саюзам харчавікоў, кв. 428 п.

Студэнцк. пасьведчаньне за № 401 Шум С. Ш., выд. с-гасп. акадэм., кв. 428 п.

Студэнцк. заліковая кніжка Еўфімка Ю. І. выд. Горэцк. с-гасп. акадэм. кв. 428 п.

Вучотна-конская карт. Градовіча М. І., выд. Барысаўск. Ваенкам., кв. 435-п.

Сяброўская кніжка № 297 Качана А. Ф., выд. Зембінскім саюзам прац. зямлі і лесу, кв. № 437-п.

Вучотна-конская кніжка № 63 Хамічонка І. І., выд. Барысаўскім РВК, кв. № 438-п.

Конская карт. Сахончыка Д. О., выд. Барысаўскім Ваенкам., кв. № 433-п.

Конская карт. Сіняка Н. М., выд. Барысаўск. РВК, кв. № 432-п.

Вучотна-конская карт. Кучынскага П. І., выд. Барысаўскім Ваенкамат., кв. № 434-п.

Конская карт. Кутулева Г. К., за № 8191, выд. Гарэцкім РВК, кв. № 428-п.

Конская карт. Волкаўца І., выд. Барысаўск. Ваенкаматам, кв. № 429-п.

Конская карт. Дзівіна А., выд. Барысаўскім Ваенкам., кв. 430 п.

Конская карт. Панкоўскага Е. І., выд. Барысаўскім Ваенкам., кв. № 431-п.

Конская карт. № 530 Белясавай Л. Р., выд. Горэцк. РВК, кв. № 428-п.

Конская карт. № 1892 Гоканава К. Ф., выд. Горэцкім РВК, кв. № 428-п.

Конская карт. Васькоўскага К. Ф., за № 1594, выд. Гарэцкім РВК, кв. № 428-п.

Конская карт. Пагодзіна Ф. І. за № 8307, выд. Гарэцкім РВК, кв. № 428-п.

Конская карт. Запрудзкай Х. С., за № 76, выдадзен. Гарэцкім РВК, кв. № 428-п.

Конская карт. № 786 Старасьценкава С. Л., выд. Гарэцк. РВК, кв. № 428-п.

Конская карт. № 88 Хліманкава С. П., выд. Гарэцк. РВК, кв. № 428-п.

Запасная кніжка № 1934 Церахава С. П. выд. Гарэцк. РВК, кв. № 428-п.

Конская карт. № 11775 Барысаўскага А. І., выд. Гарэцкім РВК, кв. № 428-п.

Конская карт. Раніцкага Я. Н., выд. Горэцк. РВК, кв. № 428-п.

Сяброўскі білет № 59093 Латышова Б. П., выд